Трэнд года — жывы гук

Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ

Штучны імунітэт — праз вакцыну

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

22 ЖНІЎНЯ 2014 г. ПЯТНІЦА № 158 (27768) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ШЧАСЦЕ З ВЯЛІКАЙ ЛІТАРЫ

Фота БЕЛТА.

Алеся і Аляксандр ПЯНКРАТ дакладна ведаюць адказ на пытанне, у чым сапраўднае шчасце. І нават імя яго ведаюць. Дакладней, імёны — Насця, Алена, Ваня, Еўдакія і Саша. Менавіта столькі дзяцей расце ў сям'і. Старэйшай дачцэ Насці Пянкрат — 15 гадоў, малодшай Сашы — усяго 3. Бацькі ж паспяваюць не толькі свой самы вялікі гонар і клопат даглядаць, але і сумяшчаць справы сямейныя з адказнай працай і актыўнай грамадскай дзейнасцю: Алеся Уладзіміраўна ўзначальвае полацкі гасцінічны комплекс «Славянскі» і кіруе Цэнтрам абароны жыцця і сямейных каштоўнасцяў Полацкай епархіі «ЗаРаджэнне»; галава сямейства Аляксандр Мікалаевіч — дырэктар ААТ «Нашы тэхналогіі».

Летась Алеся Пянкрат у ліку іншых 86 шматдзетных беларусак была адзначана высокай дзяржаўнай узнагародай — ордэнам Маці. Між іншым, грашовую прэмію, якая традыцыйна далучаецца да прысуджанага ордэна, Алеся Уладзіміраўна ахвяравала на набыццё сучаснай пляцоўкі для дзяцей, што ўваходзіць у гульнявы дзіцячы комплекс «Цытадэль», усталяваны гэтым летам у Полацку.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзіслаў ЦЫДЗІК, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па аграрнай палітыцы:

«Ужо можна гаварыць аб тым, што ў 2014 годзе ў рэспубліцы сабраны небывалы ўраджай: у засекі, па інфармацыі на 21 жніўня, засыпана 9 млн 167 тыс. т збожжа пры сярэдняй ураджайнасці 39,3 ц/га. Гэта ўжо на 2,4 млн т больш, чым летась, і на 0,6 млн т вышэй за ўзровень рэкорднага 2008 года. Несумненна, адзін з найважнейшых складнікаў поспеху ў атрыманні высокага ўраджаю ў гэтым годзе — гэта добрыя ўмовы надвор'я. Аднак не варта недаацэньваць і ролю чалавека, бо сіла ўрадлівасці зямлі забяспечвае атрыманне каля 17 цэнтнераў збожжа з 1 гектара, яшчэ 22 цэнтнеры ў фарміраванні агульнага каравая мы атрымліваем дзякуючы намаганням хлебаробаў. Такім чынам, істотную ролю ў атрыманні высокага ўраджаю збожжавых сёлета адыграла менавіта праца аграрыяў».

ПЫТАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БЯСПЕКІ

Трэба ўсяляк падымаць сацыяльны прэстыж мацярынства і шматдзетнай сям'і

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка правёў нараду па фарміраванні новага механізму дзяржаўнай падтрымкі сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што дзеючая сістэма падтрымкі сем'яў дала нядрэнныя вынікі. Яна дазволіла пераадолець негатыўную тэндэнцыю спаду нараджальнасці ў 90-я гады і дамагчыся станоўчай дынамікі. У прыватнасці, калі ў 1995 годзе ў краіне нарадзілася 101 тысяча дзяцей, то ў 2013-м — 118 тысяч. Тэндэнцыя павелічэння нараджальнасці захоўваецца і сёлета. Так, у першым паўгоддзі 2014-га нарадзілася 57,3 тыс. дзяцей, што на 1,1 тыс. больш, чым за адпаведны перыяд 2013 года. «Дынаміка хоць станоўчая, але слабенькая», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. Ён выказаў меркаванне, што тэмп павелічэння нараджальнасці дзяцей у краіне яшчэ недастатковы і павінен быць значна вышэй, але для гэтага трэба вырашыць шэраг праблем.

Па-першае, не сакрэт, што на развіццё дэмаграфічнай сітуацыі сур'ёзны ўплыў аказвае полаўзроставая структура насельніцтва. На жаль, колькасць жанчын рэпрадуктыўнага ўзросту, гэта значыць тых, хто здольны нараджаць, зніжаецца. Патэнцыйных маці з году ў год становіцца менш. Таму ў грамадстве ўсяляк трэба павышаць сацыяльны прэстыж мацярынства і шматдзетнай сям'і, адзначыў Прэзідэнт.

Паводле яго слоў, па-другое, стрымліваючым фактарам з'яўляецца тое, што ў краіне каля 70% сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей, маюць толькі адно дзіця. Як лічыць кіраўнік дзяржавы, пераламаць сітуацыю можна за кошт узмацнення мэтанакіраванай палітыкі па доўгачасовай падтрымцы сем'яў з двума і больш дзецьмі.

«Гэта, калі хочаце, пытанне нацыянальнай бяспекі. Калі ў нас не будзе дастаткова насельніцтва, тады няма чаго будзе потым разважаць аб незалежнасці», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Ён нагадаў, што яшчэ ў мінулым годзе прасіў Сяргея Румаса як шматдзетнага бацьку выступіць з ініцыятывай і падрыхтаваць прапановы па праекце «Вялікая сям'я». Яны дэталёва вывучаны спецыяльнай рабочай групай пад кіраўніцтвам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, выпрацаваны новыя прапановы, якія прааналізаваны ва ўрадзе.

Як падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, у выніку да цяперашняга часу сістэматызаваны існуючыя меры дзяржпадтрымкі сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей, і падрыхтаваны прапановы па стымуляванні нараджальнасці.

«Наша задача — выпрацаваць дадатковыя меры, як бягучыя, так і доўгатэрміновыя, для таго, каб вырашыць стратэгічную задачу росту колькасці жыхароў Беларусі», — адзначыў Прэзідэнт.

Пры гэтым, заявіў кіраўнік дзяржавы, мы паступова (грамадства гэта бачыць) адыходзім ад неабгрунтаваных ільгот. «Дык вось, сказаў ён, адыходзячы ад гэтых неабгрунтаваных ільгот, мы абавязкова гэтыя грошы будзем перанакіроўваць на падтрымку мацярынства і дзяцей».

Прэзідэнт заявіў, што ў краіне будзе рабіцца ўсё неабходнае, «каб стымуляваць нараджэнне двух, трох і больш дзяцей». «Але для гэтага патрэбны сродкі, і трэба мець на ўвазе, што вышэй за сябе мы не скокнем, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Вядома, можна прапісаць масу мерапрыемстваў, мы можам зрабіць гэта, але ў залежнасці ад таго, што ёсць у бюджэце. Будзем багацей жыць — яшчэ больш будзем рабіць».

Закранаючы тэму падтрымкі маці, сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей, Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Двое дзяцей — гэта абавязкова. А нараджэнне траіх, чацвярых трэба стымуляваць. Па меры скарачэння льгот грошы будуць накіроўвацца менавіта сюды. Прынамсі, пакуль я Прэзідэнт, гэтая сфера не будзе абдзелена ўвагай». Кіраўнік дзяржавы запатрабаваў надаваць гэтай сферы самую сур'ёзную ўвагу. Пры гэтым ён адзначыў: «Калі ў нас наогул не будзе грошай на льгатаванне і будаўніцтва жылля, то апошнія сродкі мы аддадзім менавіта шматдзетным сем'ям на будаўніцтва жылля. З гэтага трэба зыходзіць».

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: «Трэба стварыць адзін нарматыўна-прававы акт, хутчэй за ўсё закон, куды сабраць усе ільготы і меры па падтрымцы сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей».

Прэзідэнт адзначыў, што ў цяперашні час усе меры па падтрымцы дзяцей распісаны ў розных нарматыўна-прававых актах. А пажадана, каб кожная канкрэтная сям'я, нарадзіўшы першае дзіця, магла адкрыць закон і паглядзець, што канкрэтна атрымае ад дзяржавы пры нараджэнні, напрыклад, траіх дзяцей.

Кіраўнік дзяржавы таксама сказаў, што, магчыма, праект будучага закона трэба апублікаваць да ўступлення ў сілу для абмеркавання. «Упэўнены, што насельніцтва нам можа нешта падказаць. І калі гэта прымальна з пункту гледжання сённяшніх фінансаў, мы гэта прымем», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

СТАР. 2

РАЗАМ ЖЫЦЬ ВЕСЯЛЕЙ І ЛЯГЧЭЙ

На восень і зіму пажылым людзям прапануюць «прыёмныя сем'і» і «дамы зімоўкі»

У нашай краіне становіцца ўсё больш адзінокіх і адзінока пражываючых старых. Акрамя таго, практычна кожны 20-ы жыхар Беларусі з'яўляецца інвалідам (5,6% ад агульнай колькасці насельніцтва рэспублікі паводле даных Мінпрацы і сацабароны на 1 жніўня 2014 г.). А значыць, расце попыт на сацыяльныя паслугі. Пра новыя формы дапамогі такім людзям, асабліва ў асенне-зімовы перыяд — час, калі адзінокаму чалавеку, і тым больш у вёсцы, прыходзіцца няпроста — «Звяздзе» распавяла кансультант упраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі Наталля КАРАВАЯ.

ДАМЫ СЕЗОННАГА ПРАЖЫВАННЯ

Гэта арганізацыя сумеснага пражывання пажылых людзей у асенне-зімовы перыяд пад наглядам сацыяльнага работніка. Напрыклад, у Вілейскім і Салігорскім раёнах Мінскай вобласці ў такія дамы аб'ядноўваюцца непрацаздольныя людзі, якім цяжка жыць адным зімой, цяжка самастойна спраўляцца з бытавымі клопатамі. Усяго мінулай зімой у чатырох дамах сезоннага пражывання перазімавалі 25 пажылых людзей.

Нешта падобнае практыкуецца і ў Віцебскай вобласці, дзе такія дамы называюцца «дамамі зімоўкі». Там некалькі пажылых суседзяў аб'ядноўваюцца для сумеснага пражывання зімой у адным з дамоў, дзе іх абслугоўвае сацыяльны работнік. На пачатак гэтага года ў нашай краіне налічвалася 70 дамоў зімоўкі, у якіх пражывалі 144 чалавекі.

СТАР. 2

Фота БЕЛТА.

■ Надвор'е

У нядзелю нас залье

На наступным тыдні тэмпературны фон стане на 2-4 градусы ніжэй за кліматычную норму

У пятніцу тэрыторыя нашай краіны зноў трапіць у зону павышанага атмасфернага ціску і ападкі спыняцца, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава. Максімальная тэмпература ўдзень складзе плюс 18-23 градусы.

Пры павышаным атмасферным ціску і ў суботу ў нас чакаецца пераменная воблачнасць. Будзе пераважна без ападкаў. Тэмпература паветра ў ноч на суботу знізіцца ажно да 6-13 цяпла, аднак удзень павялічыцца да плюс 20-26 градусаў.

Сур'ёзныя атмасферныя франты з боку Заходняй Еўропы завітаюць на тэрыторыю краіны ўжо ў нядзелю. Таму ўначы ў заходніх раёнах, а ўдзень паўсюдна пройдуць дажджы і навальніцы. Увага: удзень на поўдні Беларусі месцамі магчымы моцныя ліўні. Тэмпература паветра ў ноч на нядзелю стане плюс 7-13 градусаў, а ўдзень чакаецца ад 19 цяпла па паўночным захадзе, да плюс 26 градусаў па паўднёвым усходзе краіны.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, з першых дзён наступнага тыдня надвор'е пачне перастройвацца ўжо на восеньскі лад. Пад уплывам франтальных падзелаў у панядзелак у многіх раёнах пройдуць дажджы, а месцамі моцныя дажджы і навальніцы. Пахаладае. Уначы прагназуецца ад 8 да 14 цяпла, а ўдзень — не больш за плюс 14-20 градусаў. Спецыялісты адзначаюць, што такі тэмпературны рэжым будзе на 2-3 градусы ніжэй кліматычнай нормы.

Сяргей КУРКАЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У Ісландыі эвакуіравалі людзей з-за магчымага вывяржэння вулкана Бардарбунга

Улады Ісландыі эвакуіравалі людзей з зоны, якая падвяргаецца рызыцы ў сувязі з магчымасцю вывяржэння вулкана Бардарбунга.

Яшчэ 19 жніўня ў паўночнай частцы нацыянальнага парку Ватнаёкюдль знаходзіліся больш за 200 турыстаў, аднак іх арганізавана эвакуіравалі з раскіданых па тэрыторыі парку гасцявых домікаў. Эксперты асцерагаюцца, што значныя тэрыторыі могуць аказацца ў небяспечнай зоне. За мінулую ноч у раёне было зарэгістравана больш за 300 падземных штуршкоў. Ачагі землятрусаў, як і ў папярэднія некалькі дзён, залягалі на глыбіні 5-10 км. 18 жніўня метэаралагічная служба Ісландыі абвясціла аранжавы (трэці з чатырох) узровень пагрозы вывяржэння. Апошні, чырвоны, узровень трывогі абвяшчаецца, калі вывяржэнне непазбежна, як правіла, за некалькі гадзін да яго пачатку. Папярэджанне перш за ўсё адносіцца да грамадзянскіх авіякампаній, якія выконваюць палёты над Ісландыяй. Бо ў выпадку вывяржэння ў паветра падымецца воблака вулканічнага попелу, які можа пашкодзіць рухавікі самалётаў. Апошняе вывяржэнне Бардарбунга адбылося ў 1910 годзе.

ХАМАС перасцерагае авіякампаніі ад палётаў над Ізраілем

Палесцінскі рух ХАМАС, які кантралюе сектар Газа, перасцярог міжнародныя авіякампаніі ад палётаў над тэрыторыяй Ізраіля, паведамляюць інфармагенцтвы.

У сваёй заяве ісламісты баявога крыла «Брыгад Ізэдзіна Касама» рэкамендуюць усім міжнародным авіякампаніям з 6.00 21 жніўня спыніць рэйсы ў ізраільскі аэрапорт Бэн-Гурыён. Ісламісты таксама перасцерагаюць жыхароў паўднёвых раёнаў Ізраіля, якія мяжуюць з сектарам Газа, ад спроб вярнуцца ў свае дамы пасля ракетных абстрэлаў. Усяго за мінулую ноч ізраільская авіяцыя атакавала два дзясяткі цэляў на тэрыторыі сектара Газа, адкуль 20 жніўня аднавіліся ракетныя абстрэлы. У сваю чаргу, прадстаўнікі ХАМАС паведамілі аб абстрэле Тэль-Авіва, аэрапорта Бэн-Гурыён, а таксама Іерусаліма.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

У прэм'ер-міністра Бельгіі ўкралі сакрэтныя дакументы

Невядомыя выкралі ноўтбук прэм'ер-міністра Бельгіі Элія ды Рупа, паведамляе партал RTL.

Надзвычайнае здарэнне адбылося ў панядзелак, але прэса даведалася пра гэта толькі ў чацвер. Паліцыя паведаміла, што на цвёрдым дыску ўкрадзенага лэптопа захоўваліся важныя дакументы, якія тычацца ўнутранай палітыкі Бельгіі. Паводле мясцовай прэсы, у камп'ютары таксама маглі быць змешчаны канфідэнцыяльныя звесткі пра каралеўскую сям'ю. Ноўтбук з машыны прэм'ера выкралі, калі ён знаходзіўся ў спартзале. Кіроўца ў гэты час таксама адлучыўся: як ён пазней растлумачыў, хацеў купіць што-небудзь у бліжэйшай кнігарні.

Зладзеі ўзламалі аўтамабіль і забралі камп'ютар, які палітык неабачліва пакінуў у багажніку. Выявіўшы прапажу, прэм'ер і яго кіроўца неадкладна звярнуліся ў бліжэйшае аддзяленне паліцыі.

■ Актуальная праблема

ДУМАЦЬ НЕ ТОЛЬКІ ПРА СЯБЕ, АЛЕ І ПРА ЭКАЛОГІЮ

«Падзяліцца» аўтамабілем ці ездзіць на веласіпедзе — што выберуць мінчане?

Сталічныя эколагі ўжо даўно «ламаюць» галаву над пытаннем разгрузкі горада ад «лішніх» аўтамабіляў. Паводле інфармацыі Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, 85% забруджвання паветра прыходзіцца менавіта на долю гарадскога транспарту. Даследаванне сітуацыі паказала: для перасоўвання мінчане аддаюць перавагу найперш уласнаму аўтамабілю. Па фінансавых выдатках высветлілася, што ён — самы танны від транспарту. А з пункту гледжання экалогіі — самы шкодны.

Санкцыі на аўто і «эфект веласіпеда»

«Ужо распрацавана канцэпцыя па ўдасканаленні якасці гарадскога транспарту на 2015—2020 гады, — паведаміў **дырэктар Беларускай асацыяцыі экспертаў і сюрвееraў на транспарце Юрый ВАЖНІК.** — Мы імкнёмся атрымаць парытэт паміж грамадскім і ўласным транспартам».

Для рэгулявання колькасці ўласных аўто ў хуткім часе пачнуцца мерапрыемствы па ўвядзенні сістэмы платных парковак. Пілотнай зонай стане новы паркінг на вуліцы Гікала, які адкрыецца 1 верасня. Пасля завяршэння праекта ў Мінску з'явяцца 12 тысяч парковачных месцаў. Мяркуецца, што ўвядзенне абавязковай платы за паркінг заахвоціць людзей карыстацца грамадскім транспартам, а не ўласным. «Горад да гэтага падрыхтаваны, — падсумаваў спецыяліст. — Мы чакаем, што людзі ўсё ж пачнуць думаць не толькі пра сябе, але і пра экалогію». Да таго ж уносіліся прапановы зрабіць для кіроўцаў аўто платным уезд у цэнтр Мінска.

СТАР. 6

ISSN 1990 - 763X

ПЫТАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БЯСПЕКІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Старшыня праўлення адкрытага акцыянернага таварыства «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь» Сяргей Румас расказаў аб прапановах па доўгатэрміновых мерах стымулявання нараджальнасці трэцяга і наступных дзяцей, акцэнтаваўшы ўвагу на праграме «Вялікая сям'я». Так, прапануецца пры нараджэнні трэцяга і наступных дзяцей налічваць сям'і $10 тыс. на дэпазітны рахунак. Гэтая сума будзе ўлічвацца ў валюце і штогод індэксавацца на ўзровень інфляцыі долара. Тэрмін дзеяння праекта складзе 5 гадоў. Выкарыстанне гэтых сродкаў будзе магчымым па дасягненні дзіцем 18 гадоў. Гэтыя грошы можна будзе накіраваць на паляпшэнне жыллёвых умоў, атрыманне дзіцем адукацыі, паслуг аховы здароўя і фарміраванне дадатковай пенсіі маці. З улікам штогадовай індэксацыі пасля 18-гадовага перыяду сям'я атрымае прыблізна $14 тыс. Да дасягнення 18-годдзя дзіцяці сродкі могуць быць выкарыстаны толькі ў надзвычайным выпадку, пад якім разумеецца неабходнасць аказання складанай медыцынскай дапамогі любому члену сям'і.

Крыніцай матэрыяльных рэсурсаў з'яўляюцца сродкі фонду нацыянальнага развіцця, якія ацэньваюцца ў Br1,8 трлн штогод. За перыяд дзеяння праекта, паводле ацэнак спецыялістаў, будзе выдаткавана каля $700-800 млн. Аднак гэта акупны праект, паколькі сродкі, залічаныя на дэпазітны рахунак маці ў ААТ «АСБ Беларусбанк», будуць перададзены ў кіраванне Банку развіцця, які ўкладвае іх у эканоміку. Урад прапануе пачаць праект з 1 студзеня 2015 года.

Праектам прапануецца таксама даць магчымасць грамадзянам пры нараджэнні чацвёртага дзіцяці самастойна сфарміраваць дэпазітны рахунак і пакласці на яго суму да $5 тыс., такую ж суму ўнясе сям'і дзяржава.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што праект можа быць ажыццёўлены ў Беларусі. «Нармальны праект. Думаю, мы яго асілім. Гэта трэба рабіць. Дзеці — гэта галоўнае. Не будзе дзяцей — не будзе дзяржавы, — адзначыў Прэзідэнт. — Доўгатэрміновай праграме быць. Яна простая, зразумелая ўсім. Гэта крок наперад на працяглую перспектыву».

Прэзідэнт падкрэсліў, што грошы, выдзеленыя сям'і ў межах праекта, дзяржава сабе ні ў якім разе не забярэ.

РАЗАМ ЖЫЦЬ...

ДАМЫ САМАСТОЙНАГА ПРАЖЫВАННЯ

Пустуючы жылы дом прыводзіцца ў нармальны стан, і ў яго ўсяляюцца непрацаздольныя грамадзяне, якія не маюць уласнага жылля, або тыя, хто апынуўся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі. Як правіла, такі дом знаходзіцца пад патранатам ТЦСАН, сельвыканкама, а пры неабходнасці падключаюцца і іншыя службы раёна (праваахоўныя органы, медыцынскія ўстановы і інш.).

На 1 жніўня 2014 года ў Беларусі пражывалі 2 млн 549 тыс 628 пенсіянераў.

Усяго на пачатак гэтага года ў 19 дамах самастойнага (сумеснага) пражывання пражывалі 110 чалавек. Больш за ўсё такіх дамоў — у Гомельскай вобласці.

«ПРЫЁМНЫЯ СЕМ'І» ДЛЯ ПАЖЫЛЫХ

Гэта калі сацыяльны работнік бярэ да сябе на зіму пажылога чалавека, каб даглядаць яго. Такое ўладкаванне старых на пражыванне ў сем'і практыкуецца ў Вілейскім і Маладзечанскім раёнах Мінскай вобласці. Пры гэтым складаецца трохбаковы дагавор паміж карыстальнікам паслуг (пенсіянерам), сям'ёй, якая прадастаўляе паслугі, і тэрытарыяльным цэнтрам сацабслугоўвання насельніцтва (ТЦСАН). На пачатак 2014 года ў рэспубліцы было 149 прыёмных сем'яў, у якіх пражывалі 165 старых.

Ёсць яшчэ такая форма працы, як гасцявая сям'я. Гэта калі адзінокіх старых уладкоўваюць у сем'і часова — на выхадныя або святочныя дні. Яна дзейнічае ў Пухавіцкім, Старадарожскім, Маладзечанскім, Вілейскім раёнах Міншчыны.

НОВЫЯ ПРАЕКТЫ

«Санаторый на даму» — гэты праект арганізуецца ў Мінскай вобласці сумесна са спецыялістамі аховы здароўя і культуры. Пры гэтым адзінокім састарэлым людзям на працягу 21 дня аказваюцца на даму медыцынскія паслугі (масаж, фізіятэрапія, дыетычнае харчаванне за кошт прыцягнутых тэрытарыяльным цэнтрам сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва спонсарскіх сродкаў, заварваюцца фітачаі і г.д.). Сацыяльны работнік у гэты перыяд абслугоўвае сваіх падапечных 5 разоў на тыдзень і рыхтуе для іх ежу. Работнікі культуры арганізуюць міні-канцэрты, экскурсіі, выезды бібліятэкараў і г.д.

Санаторыі на даму арганізаваны ў Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай абласцях.

Акрамя таго, ва ўсіх рэгіёнах Беларусі рэалізуюцца сацыяльныя праекты па такіх кірунках, як навучанне пажылых людзей аказанню першай дапамогі і рэагаванню на надзвычайныя сітуацыі, навучанне камп'ютарнай граматнасці, аказанне пажылымі людзьмі дапамогі маладым сем'ям.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Святлана БУСЬКО.

■ Дыскусія

ПРАЦАВАЦЬ. НЕ НАЖЫВАЦЦА

Дэпутаты пра барацьбу з хабарніцтвам

Ужо больш за тыдзень ідзе грамадскае абмеркаванне праекта Закона «Аб барацьбе з карупцыяй». Людзі выказваюць свае думкі наконт асобных артыкулаў законапраекта, імкнуцца звярнуць увагу распрацоўшчыкаў і на тое, што, на старонні погляд, у законапраекце не прадугледжана: на розныя формы злоўжывання дзяржаўнай пасадай, народны менталітэт, дадатковыя спосабы ўтаіць незаконна нажытую маёмасць... Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў выказалі «Звяздзе» свае меркаванні па законапраекце.

Фота БЕЛТА.

Алена БЕРАСНЕВА, дэпутат па Гродзенскай-Занёманскай выбарчай акрузе №49:

«Прэстыж працы чыноўніка трэба павышаць»

— Папраўкі ў законапраект «Аб барацьбе з карупцыяй» прымаюцца па ініцыятыве Прэзідэнта, што сведчыць пра паслядоўнасць яго палітыкі. Ён рэгулярна звяртаецца да тэмы падтрымання парадку ва ўсіх сферах жыцця дзяржавы і грамадства, у тым ліку да тэмы процідзеяння хабарніцтву.

Барацьба з карупцыяй была адным з асноўных тэзісаў у сёлетнім Пасланні Прэзідэнта беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу. Кіраўнік дзяржавы прывёў шэраг прыкладаў, калі дзяржаўныя служачыя высокага ўзроўню, якія абавязаны быць ва ўсім прыкладам і самім змагацца з карупцыяй, часта маюць дачыненне да карупцыйных дзеянняў. Чалавек на дзяржаўнай пасадзе павінен прыносіць карысць людзям. Нездарма ж мы часта звяртаемся да выслоўя «ўлада для народа». Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, якія наступствы можа мець злоўжыванне дзяржаўнай уладай. Прыклад гэтаму — падзеі ў суседняй Украіне, дзе канфлікт, які ўзнік на хвалі барацьбы з карупцыяй, перарос у ваеннае супрацьстаянне.

У горадзе Гродна, дзе знаходзіцца мая выбарчая акруга, не было, здаецца, гучных карупцыйных скандалаў, але я выступаю за папраўкі ў законапраект. Няхай ён стане мерай, якая папярэджвае такія злачынствы. Трэба, каб чыноўнік перад уступленнем на пасаду ўсвядоміў усю адказнасць перад народам. Дзяржаўны служачы ні ў якім разе не павінен нажывацца ні на інвестарах, ні на людзях. Яго рэпутацыя павінна быць крышталь чыстай.

Наконт пункта аб дэклараванні даходаў і маёмасці, які асабліва абмяркоўваецца, заўважу, што гэта было раней і ў нашай краіне, і за мяжой. Калі чалавек знаходзіцца на дзяржаўнай службе і ў яго публічная праца, то няма чаго ўтойваць свае даходы. Заўважу, што я і мая сям'я з 2006 года (у свой час я была членам Гродзенскага аблвыканкама, дэпутатам абласнога савета, пасля мяне абралі дэпутатам Палаты прадстаўнікоў) — дэкларуем свае даходы. Нагадаю, калі людзі балатуюцца ў дэпутаты любога ўзроўню, то яны абавязаны прадаставіць інфармацыю пра свае даходы, і для нас гэта нармальная практыка.

Ад сябе дадам, што з прад'яўленнем больш высокіх патрабаванняў да дзяржаўных служачых паралельна трэба павышаць і прэстыж працы чыноўнікаў, і, адпаведна, ім зарплаты. Бо сёння, калі чалавек толькі прыходзіць на дзяржаўную пасаду і не мае яшчэ стажу і класнасці, то зарплата ў яго нізкая. Неабходна зрабіць так, каб спакусы выкарыстоўваць дзяржаўную пасаду ў карысных мэтах не ўзнікала.

Валянцін МІЛАШЭЎСКІ, дэпутат па Брэсцкай-Цэнтральнай выбарчай акрузе №2:

«Самае важнае — гэта не пакараць невінаватага»

— З-за хабарніцтва пакутавала вялікая колькасць дзяржаў. У выніку многія з іх спынілі сваё існаванне. Карупцыя ў Расійскай імперыі квітнела яшчэ пры Аляксандру II, а пры Мікалаю II прывяла да такой сітуацыі, калі амаль ніякае пытанне не магло вырашыцца пры дапамозе нарматыўных актаў: яго было прасцей вырашыць за хабар. І тое, што робіцца зараз у нашых суседзяў, — гэта таксама адзін з вынікаў карупцыі.

Зараз ідзе грамадскае абмеркаванне праекта Закона «Аб барацьбе з карупцыяй», і трэба разумець, што ў кожнага чалавека сваё меркаванне. Але ў выніку павінны выпрацавацца нормы, якія ў большай ступені адпавядаюць патрабаванням грамадства.

Адным з самых праблемных пытанняў з пункту гледжання пранікнення карупцыі былі дзяржаўныя закупкі. Пакаранне за няправільнае іх правядзенне, асабліва за кошт бюджэтных сродкаў, было прадугледжана і раней, але зараз яно больш дэталізавана. Натуральна, любая дзяржава або арганізацыя, як бюджэтная, так і прыватная, зацікаўлена ў тым, каб купіць тавар па выгаднай цане ў непасрэднага вытворцы без усялякіх надбавак, якія могуць выстаўляць пасрэднікі. Пры нармальным правядзенні тэндараў бюджэтныя сродкі, як правіла, эканомяцца. Тут галоўнае, каб заканадаўства прадугледжвала дапушчальнасць вытворчай рызыкі, бо яна заўсёды мае месца быць. Напрыклад, сёння можна знайсці, колькі каштуе любы тавар у розных краінах, але калі пралічыць усе страты, звязаныя з яго пакупкай (дастаўку, растаможку і іншае), то складана сказаць, дзе яго можна будзе купіць ці заказаць танней — за мяжой ці ў нас. Таму кіраўнік не заўсёды можа ўсё прадугледзіць, сказаць, што будзе праз паўгода—год, які спосаб закупкі неабходнага тавару абыдзецца прадпрыемству танней.

Самае важнае — гэта не пакараць чалавека невінаватага. Інакш мы проста адаб'ём ахвоту працаваць у ініцыятыўных людзей, якія хочуць для свайго прадпрыемства або арганізацыі выгадна закупіць нейкае абсталяванне, расходны матэрыял. Кантралюючыя органы павінны параўноўваць нарматыўныя базы, якія былі на момант заключэння здзелкі, на момант рэалізацыі і на момант праверкі.

Зараз абмяркоўваецца і тое, што чыноўнікі-карупцыянеры не будуць атрымліваць пенсіі за выслугу гадоў. Пры падрыхтоўцы законапраекта прапаноўвалі нават пазбаўляць гэтых людзей і права на льготны крэдыт, які яны маглі аформіць, знаходзячыся на дзяржаўнай пасадзе. Гэта значыць, служачы, абвінавачаны ў хабарніцтве, абавязваўся б вярнуць узятыя грошы. Але трэба разумець, што чыноўнік, нават выкрыты на карупцыйным злачынстве, — гэта таксама чалавек. Сёння дзяржаўны служачы не жыве больш багата, чым звычайныя людзі. І калі чыноўнік бярэ крэдыт, то ён робіць гэта не асабіста для сябе, а для сям'і, асабліва тады, калі ёсць дзеці. Таму пазбаўляць чалавека таго, на што ён меў права на той момант, калі браў гэты крэдыт, — таксама няправільна. Ёсць іншыя спосабы пакарання.

Яшчэ адна палемічная норма законапраекта — гэта дэкларванне даходаў і маёмасці дзяржаўных служачых. Яна не новая. Дэкларацыі даўно ўжо прадастаўляюць дзяржаўныя служачыя, кіраўнікі прадпрыемстваў, арганізацый. Сёння атрымаць інфармацыю пра даходы чалавека, асабліва таго, які працуе ў рэальным сектары, нескладана. Але, тым не менш, адпаведная норма ў законе павінна быць. Па вялікім рахунку, сумленнае стаўленне чыноўніка, як дзяржаўнага служачага, да сваіх абавязкаў спрыяе павышэнню ўзроўню даверу.

Наталля КЛІМОВІЧ, дэпутат па Чкалаўскай акрузе №96 горада Мінска:

«Многія патрабуюць зрабіць пакаранне за хабарніцтва яшчэ больш жорсткім»

— Ідзе абмеркаванне законапраекта, і зараз ужо ад грамадзян паступіла каля 1000 прапаноў. Гэта дастаткова вялікая колькасць, а грамадская дыскусія будзе доўжыцца яшчэ каля трох тыдняў. Нягледзячы на даволі суровыя меры, якія і зараз прымаюцца ў дачыненні да карупцыянераў, многія людзі патрабуюць зрабіць пакаранне за такія злачынствы яшчэ больш жорсткім.

Вельмі сур'ёзна абмяркоўваюцца дзяржзакупкі, за парушэнне парадку правядзення якіх вызначана мера пакарання... Мы ўсе ведаем, што дзяржаўныя закупкі — гэта тая сфера, дзе праяўленне карупцыі найбольш верагодна. Са змяненнем падыходаў да іх правядзення зменшыцца і колькасць адпаведных злачынстваў.

Трэба памятаць, што пры правядзенні дзяржзакупак якасць і цана тавару маюць асаблівае значэнне. Часта яны не адпавядалі заяўленым патрабаванням. У працы камісіі па закупках выяўляліся парушэнні. Новы закон будзе спрыяць бюджэтным папаўненням. Магчыма, неабходна было б узмацніць адказнасць фірмы-пастаўшчыка за якасць закупленых у яе тавараў або аказаных паслуг. Упэўнена, што гэта зробіць уплыў на тых людзей, якія адказваюць за падрыхтоўку гэтага кірунку ў законапраекце.

Праз тры тыдні, калі абмеркаванне скончыцца, распрацоўшчыкі закона сістэматызуюць унесеныя грамадзянамі прапановы. Затым зноў па законапраекце будуць збірацца працоўныя групы, і ў выніку ён у «адшліфаваным» выглядзе будзе падрыхтаваны да прыняцця яго на восеньскай сесіі.

Запісала Надзея ЮШКЕВІЧ.

■ Стасункі

КАНФЛІКТ «ЛІЦЭНЗІЙ» ВЫЧАРПАНЫ

Беларусь і Украіна ўзаемна адмянілі ліцэнзаванне і пошліны

На брыфінгу ў Міністэрстве замежных спраў, прысвечаным аднаўленню рэжыму свабоднага гандлю паміж Беларуссю і Украінай, Ігар НАЗАРУК, дырэктар дэпартамента знешнеэканамічнай дзейнасці МЗС краіны, паведаміў, што канфлікт «ліцэнзій» вычарпаны.

— З 19 жніўня з нуля гадзін якія-небудзь меры, якія абмяжоўваюць допуск да ўзаемнага гандлю, адменены. Беларусь не прымяняе ліцэнзаванне да імпарту піва, кандытарскіх вырабаў і іншай прадукцыі. Украіна не прымяняе спецпошліны, якія вагаюцца ў памеры ад 50% да 60%, — заявіў прадстаўнік МЗС.

Кажучы пра тое, як адбіліся ўзаемныя абмежаванні на тавараабароце паміж дзвюма краінамі, Ігар Назарук паведаміў, што, сапраўды, падзенне ўзаемнага тавараабароту было зафіксавана.

— З-за шэрагу прычын лічбы ўзаемнага тавараабароту Беларусі і Украіны трохі змяніліся. Ёсць падзенне на ўзроўні прыкладна 5%.

Прадстаўнік беларускага знешнепалітычнага ведамства лічыць гэта не вельмі істотнай лічбай. У той жа час ён звярнуў увагу журналістаў і на той факт, што шэраг тавараў схільны да сезонных ваганняў. Напрыклад, летам падае попыт на шакаладныя кандытарскія вырабы, а на напоі, наадварот, узрастае.

— Аднак, што тычыцца кандытарскіх вырабаў і цукру, то па выніках першага паўгоддзя мы, наадварот, бачым не падзенне, а рост амаль на 25%. Хоць, здавалася б, тавар да 19 жніўня знаходзіўся ў спісе ліцэнзуемых. Таму трэба ставіцца да гэтага спакойна.

Ігар Назарук падкрэсліў, што мэтай працэдуры ліцэнзавання было навядзенне парадку на ўнутраным рынку краіны. Па той інфармацыі, якая зараз ёсць, цэнаўтварэнне прыходзіць у стабільны стан.

Дыпламат выказаў упэўненасць, што ў будучыні падобныя канфлікты не паўтарацца.

Ён нагадаў, што Беларусь, Украіна і Расія з'яўляюцца ўзаемазвязанымі эканомікамі:

— У нас вельмі моцныя гандлёва-эканамічныя сувязі. Таму ніводнаму з бакоў не выгадна аб'яўляць гандлёвыя войны. Гэта заўсёды будзе працаваць па прынцыпе бумеранга.

Надзея ЮШКЕВІЧ

■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

ГАНДЛЁВАЕ ФІНАНСАВАННЕ БЕЛАРУСБАНКА — АМАЛЬ 2 МЛРД USD

Вядучы экспарцёр нафтапрадуктаў Беларуская нафтавая кампанія ўручыла Беларусбанку дыплом у намінацыі «Лепшы банк 2013 па міжнародных праектах».

Як паведамілі ў прэс-службе буйнейшай фінансавай установы краіны, акцыянернае таварыства «Беларуская нафтавая кампанія» з'яўляецца карпаратыўным кліентам банка. За час супрацоўніцтва сумесна рэалізавана мноства здзелак па разліках за нафту і нафтапрадукты, у тым ліку з гандлёвым фінансаваннем ад вядучых еўрапейскіх і расійскіх банкаў. Штомесяц кампанія экспартуе да 1 млн тон нафтапрадуктаў.

Сяргей КУРКАЧ.

ЛЕПШЫХ ПАШТАВІКОЎ ВЫБІРАЛІ Ў БРЭСЦЕ

У Брэсце прайшлі традыцыйныя спаборніцтвы за званне лепшых начальнікаў паштовых аддзяленняў. На конкурс прыехала 28 удзельнікаў, пераможцаў раённых этапаў. Камісія, як заўсёды, ацэньвала выкананне тэарэтычнага і практычнага заданняў.

Па выніках конкурсу першай сярод начальнікаў і намеснікаў начальнікаў гарадскіх паштовых аддзяленняў стала Таццяна Кузьміна (АПС Брэст-16), на другім месцы — Таццяна Скробатава з 30-га аддзялення, на трэцім — Алена Лукашэвіч з Мікашэвічаў Лунінецкага раёна.

Сярод начальнікаў сельскіх аддзяленняў сувязі прызёрамі сталі Аксана Каранчук (Дамачава Брэсцкі раён), Анастасія Юруць, начальнік аддзялення сувязі агульнацэхавага персаналу Брэсцкага раёна, і Тамара Новак (Лемяшэвічы Пінскі раён).

Яна СВЕТАВА.

З РЫЗЫКАЙ ДЛЯ ЖЫЦЦЯ

Жыхар Чавусаў вынес з агню 80-гадовую жанчыну.

Іх дамы знаходзяцца па суседстве, і Ігар першым убачыў, як з-пад даху хаты старэнькай бабулі выбіваецца чорны дым. Ён выклікаў выратавальнікаў, а сам кінуўся на дапамогу суседцы.

Калі рвануў дзверы на сябе, ледзь на задыхнуўся ад дыму. Убачыўшы старую, схапіў яе на рукі і вынес на вуліцу. Потым зноў вярнуўся і выцягнуў з дома газавы балон. Пакуль была магчымасць, выносіў з ахопленай полымем хаты розныя каштоўныя рэчы.

— Мужнасцю гэтага чалавека можна толькі ганарыцца, — пракаментаваў гэты выпадак **інспектар Чавускага РАНС Захар ДАНІЛЕНКА.** — Як расказала жанчына, спрацаваў пажарны апавяшчальнік, але самастойна выбрацца з хаты яна не магла. Калі б не сусед, загінула б.

А вось сам Ігар Сыражэжкін нічога гераічнага ў сваім учынку не бачыць. А на пытанне: «Ці было страшна?» сціпла адказвае: «У галаве круцілася адна думка — толькі б паспець....»

Нэлі ЗІГУЛЯ.

НА МІНШЧЫНЕ МОЖНА Ў БРУСНІЦЫ

У Віцебскай і Мінскай абласцях устаноўлены тэрміны збору дзікарослых ягад — брусніц і журавін — у сёлетнім сезоне.

Як паведамілі ў прэс-службе Міністэрства лясной гаспадаркі, на тэрыторыі Віцебшчыны збіраць брусніцы дазволена з 16 жніўня, журавіны — з 25 жніўня. У Мінскай вобласці адпраўляцца ў брусніцы можна будзе ўжо з сённяшняга дня, а вось з пачаткам збору журавін, каб не мець непрыемнасцяў, давядзецца яшчэ пачакаць. Гэтыя ягады на Міншчыне дазволена нарыхтоўваць з 6 верасня. Адпаведныя рашэнні наконт устанаўлення тэрмінаў збору дзікарослых ягад прынялі абласныя выканаўчыя камітэты. Кантроль жа за захаваннем тэрмінаў і правілаў збору ўскладзены на райвыканкамы, дзяржаўныя вытворчыя лесагаспадарчыя аб'яднанні і тэрытарыяльныя органы Мінпрыроды.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЛІСА НАПАЛА НА ДЗІЦЯ

На трохгадовае дзіця падчас адпачынку на прыродзе напала ліса. Як паведаміў карэспандэнту газеты галоўны санітарны ўрач Лунінецкага раёна Аляксандр БАЙДУК, 14 жніўня сям'я адпачывала каля вёскі Галы Бор Лунінецкага раёна. Раптам да дзіцяці наблізілася ліса і паспрабавала ўкусіць малога. Але бацькі адрэагавалі хутка: звера адагналі, потым забілі, а дзіця даставілі ў бальніцу.

Ліса ўсё ж паспела падрапаць твар дзіцяці. Паколькі ніхто не сумняваецца ў тым, што яна была шалёнай (здаровы звер не наблізіцца да людзей сярод белага дня), пацярпеламу быў прызначаны курс з пяці прышчэпак ад шаленства. Паводле слоў Аляксандра Байдука, маленькі пацыент ужо атрымаў тры такія прышчэпкі і адчувае сябе здавальняюча.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

■ «Палітычная пятніца» з Аляксандрам ШПАКОЎСКІМ

ІСЛАМСКАЯ ДЗЯРЖАВА ІРАКА І ЛЕВАНТА:

ЯК «ДЗЕТКІ»-ТЭРАРЫСТЫ ВЫЙШЛІ З-ПАД «БАЦЬКОЎСКАЙ АПЕКІ»?

Новы выклік сусветнай бяспецы

Апошнім часам у цэнтры ўвагі айчыннай інфармацыйнай прасторы знаходзіцца грамадзянскі канфлікт ва Украіне, і гэта натуральна. Між іншым, на Блізкім Усходзе сфарміравалася чарговая пагроза, якая нясе новыя выклікі бяспецы ўсяго свету, у тым ліку Беларусі.

ПАГРОЗА ШТАТАМ

10 чэрвеня 2014 года тэрарыстычная групоўка радыкальных сунітаў «Ісламская дзяржава Ірака і Леванта» (ІДЗІЛ), якая вядзе сваю дзейнасць яшчэ з сярэдзіны 2000-х гадоў, захапіла другі па велічыні горад Ірака — двухмільённы Масул і аб'явіла пад сваім кантролем шэраг рэгіёнаў, што юрыдычна адносяцца да Ірака і Сірыі. Ужо 29 чэрвеня на захопленых тэрыторыях была абвешчана ісламская тэакратычная дзяржава — халіфат; баевікі наладзілі выпуск уласных пашпартоў і аб'явілі аб намеры ў хуткім часе заняць Багдад. Тэрарысты працягваюць весці актыўныя баявыя дзеянні супраць урадавых войск і груповак «умеранай апазіцыі» ў Сірыі, іракскай арміі, амерыканскіх вайскоўцаў, прадстаўнікоў прыватных вайсковых кампаній, а таксама апалчэння аўтаноміі Іракскага Курдзістана. Супрацьстаянне ІДЗІЛ стала адным з пунктаў павесткі «пераразгрузкі» ў стасунках паміж Злучанымі Штатамі і Іранам, які яшчэ не так даўно адназначна адносіўся амерыканскай адміністрацыяй да «ворагаў нацыянальнай бяспекі» з ліку краін «восі зла».

Правячыя колы ў Вашынгтоне добра ўсведамляюць небяспеку, што зыходзіць ад «Ісламскай дзяржавы», тым больш што баевікі сістэматычна нагадваюць амерыканскаму кіраўніцтву пра сваё існаванне. Некалькі дзён таму ісламісты апублікавалі відэастужку, дзе запісана пакаранне смерцю амерыканскага журналіста Джэймса Фоўлі, а 18 жніўня ў спецыяльным відэазвароце паабяцалі перанесці тэрарыстычную дзейнасць на тэрыторыю ЗША, каб «утапіць у крыві» ўсіх амерыканцаў.

АМБІЦЫІ ІДЗІЛ: АД БЛІЗКАГА УСХОДУ ДА ПОЎДНЯ ЕЎРОПЫ І АЗІІ

Між тым у Іраку колькасць бежанцаў, якія ўцяклі «з-пад улады халіфа», вагаецца, па розных даных, ад 500 тысяч да мільёна чалавек, што ўжо дае падставы характарызаваць сітуацыю як гуманітарную катастрофу. Не дадае аптымізму і той факт, што тэрытарыяльныя амбіцыі «халіфата» выходзяць далёка за межы Ірака і Сірыі, дзе ІДЗІЛ з 2013 года бярэ актыўны ўдзел у грамадзянскай вайне супраць афіцыйнага ўрада і прэзідэнта Башара Асада.

У распаўсюджанай баевікамі карце да сферы ўплыву «Ісламскай дзяржавы» адносіцца не толькі Блізкі Усход, але нават Балканскі і Пірынейскі паўастравы, а таксама ўся тэрыторыя Паўднёва-Заходняй і Цэнтральнай Азіі. Па задуме «геапалітыкаў» з ІДЗІЛ, цэнтральнаазіяцкія краіны, у тым ліку дзяржавы — члены АДКБ (Казахстан, Кыргызстан, Таджыкістан) павінны быць аб'яднаныя ў так званы Харасан — гістарычны рэгіён, што складаўся з частак тэрыторый сучасных Ірана, Таджыкістана, Афганістана, Узбекістана, Туркменістана. Не абмінаюць увагай баевікі і Расію, дзе ІДЗІЛ плануе засяродзіцца на «вызваленні» прававерных з-пад улады Крамля. Значную вагу ў групоўцы, што фактычна зараз выйшла на ўзровень штучнай дзяржаўнасці, маюць выхадцы з Паўночнага Каўказа, таму гэтыя пагрозы не здаюцца пустым гукам для расійскага кіраўніцтва.

АДКУЛЬ «РАСТУЦЬ НОГІ» Ў ІСЛАМСКАГА ТЭРАРЫЗМУ?

Аналізуючы прычынна-выніковыя сувязі, што прывялі да сітуацыі, калі багаты Блізкі Усход фактычна стаў яшчэ адной «гарачай кропкай», рассаднікам тэрарызму і экстрэмізму ў свеце, трэба адзначыць, што зараз міжнародная супольнасць «збірае ўраджай» з таго «зерня», што было пасаджана спецыяльнымі службамі заходніх краін (найперш Вялікабрытаніі і ЗША) яшчэ ў 70—80-я гады мінулага стагоддзя.

У барацьбе з савецкім уплывам, а затым і са свецкімі рэжымамі на Блізкім Усходзе, англаамерыканцы абапіраліся на персідскія манархіі, Пакістан і, вядома, на ісламскіх экстрэмістаў. Галоўнымі мэтамі ЗША было атрыманне кантролю над нафтавымі рэсурсамі Персідскага заліва, ліквідацыя рэжымаў арабскага нацыяналізму, паражэнне СССР у Афганістане і наогул у «халоднай вайне». Вядомы эксперт па пытаннях Блізкага Усходу, галоўны рэдактар Radio France Internationale Рычард Лабев'ер у сваёй кнізе «Долары тэрору: Злучаныя Штаты Амерыкі і ісламісты» прыходзіць да высновы, што для стварэння процівагі арабскім лідарам кшталту Абдэля Насера, Муамара Кадафі, Садама Хусэйна, а пазней і Башара Асада, якія прытрымліваліся адносна свецкага «арабскага нацыяналізму», спецыяльныя службы ЗША разам з кіраўніцтвам Саудаўскай Аравіі прынялі ўдзел у фінансаванні і развіцці трансарабскіх радыкальных структур. Ідэалогія апошніх адмаўляе нацыянальную ідэю, якая аб'яўляецца вынаходніцтвам «няверных» з мэтай раскалоць «мусульманскі свет».

Падаецца, што нізлажэнне, а пасля і фізічная ліквідацыя арабскіх лідараў праводзіліся з мэтай забеспячэння кантролю заходняга капіталу над нафтавымі рэсурсамі краін Блізкага Усходу. Гэтую пазіцыю пацвярджае ў сваёй рабоце і Рычард Лабев'ер, які прыйшоў да высновы, што «транснацыянальная тэрарыстычная сетка, у стварэнні якой прынялі ўдзел ЗША і Саудаўская Аравія, з'яўляецца адным з асноўных інструментаў глабалізацыі, эканамічных і сацыяльна-палітычных пераўтварэнняў, што фарміруюць новы сусветны парадак, у аснове якога застаецца глабальная гегемонія ЗША».

Між іншым, у глабальнай палітыцы не заўжды рэалізуюцца задумы тэхнолагаў і спецыялістаў розных закрытых арганізацый. Гэтаксама і на Блізкім Усходзе сумнавядомая «арабская вясна» ды іншыя «народныя рэвалюцыі», дзе амерыканцам з дапамогай ісламістаў удалося зрынуць доўгатэрміновыя свецкія арабскія рэжымы, не прывялі да чаканага кантролю заходніх кампаній над нафтавымі радовішчамі. Па-першае, абвастрыліся супярэчнасці паміж сучаснай амерыканскай адміністрацыяй і іх нядаўнімі хаўруснікамі з Саудаўскай Аравіі; па-другое, ісламісты хутка выйшлі з-пад уплыву сваіх стваральнікаў. А можа, і само «шэфства» было хіба амерыканскай ілюзіяй і заставалася актуальным, пакуль быў агульны вораг? Напрыклад, тая ж групоўка ІДЗІЛ, што яшчэ ў 2013 годзе карысталася падтрымкай амерыканцаў, калі вяла вайну «за дэмакратыю і свабоду супраць крывавага рэжыму Башара Асада» ў Сірыі, зараз стварае небяспеку нафтавым інтарэсам ЗША ў рэгіёне. Баевікі ўжо захапілі частку сірыйскай нафтаздабычы, а з Ірака кампаніі «British Petrolium» і «Exxon Mobil» былі вымушаны эвакуіраваць сваіх супрацоўнікаў з ліку грамадзян заходніх краін.

Гэта значыць, «міжнародны ісламскі тэрарызм» у яго сучаснай версіі з'яўляецца «нечаканым дзіцем» знешняй палітыкі ЗША, якое зараз «падрасло» і паражае сваім заакіянскім бацькам.

ЯК РЭАГАВАЦЬ БЕЛАРУСІ НА НОВЫЯ ВЫКЛІКІ?

Цікавым у гэтай сувязі выглядае папярэджанне-прагноз Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. Яшчэ на пачатку 2011 года ў інтэрв'ю ўплывоваму амерыканскаму выданню — газеце «The Washington Post» — ён адзначаў, што амерыканцы абавязкова панясуць адказнасць за наўмысную «дэстабілізацыю арабскай дугі».

Асноўваючыся на гэтых пазіцыях, можна лічыць, што нашай краіне неабходна па меры магчымасцяў рыхтавацца да новых выклікаў. Будучы сярэдняй па памерах, адносна ўстойлівай еўрапейскай дзяржавай, Беларусь не стварае пагрозы для бяспекі суседніх краін. Аднак наша краіна вымушана рэагаваць і працаваць з тымі канфліктнымі сітуацыямі, што ўзнікаюць у выніку цынічнай палітыкі буйных актараў.

У распаўсюджанай баевікамі карце да сферы ўплыву «Ісламскай дзяржавы» адносіцца не толькі Блізкі Усход, але нават Балканскі і Пірынейскі паўастравы, а таксама ўся тэрыторыя Паўднёва-Заходняй і Цэнтральнай Азіі.

Зыходзячы з чарговага абвастрэння на Блізкім Усходзе, Беларусі неабходна прыкласці ўсе магчымыя намаганні ў межах АДКБ і дапамагчы ўзброеным сілам, пагранічным структурам, праваахоўным органам нашых саюзнікаў у Цэнтральнай Азіі. З улікам адсутнасці памежнага і мытнага кантролю на дзяржаўнай мяжы з Расіяй, неабходна яшчэ раз правесці дадатковую рэвізію сістэмы нацыянальнай бяспекі. У сувязі са з'яўленнем новых патэнцыяльных выклікаў — прыняць патрэбныя меры па карэкціроўцы працы адпаведных структур — у прыватнасці, падраздзяленняў па грамадзянстве і міграцыі Міністэрства ўнутраных спраў. Немалаважным таксама з'яўляецца і працяг традыцыйнай палітыкі, накіраванай на падтрыманне міжканфесійнага і міжэтнічнага міру, нацыянальнага адзінства ў беларускім грамадстве.

■ За кадрам

ЛЕГЕНДЫ ПАД НОВЫМ «СОУСАМ»

Тэлеканал АНТ распавядае пра «Бітлз» і «Ролінг Стоўнз» па-беларуску

У новым сезоне гледачоў чакае прэм'ера праекта «Легенды.Live». Вядучы Іван Падрэз у кожным выпуску будзе распавядаць пра самыя цікавыя перыяды з творчых біяграфій музыкантаў і песень, вядомых на ўвесь свет. Цікавыя факты, абноўленыя аранжыроўкі і толькі жывое гучанне — вось што чакае ў гэтым падарожжы. Мы завіталі на здымачную пляцоўку праграмы, каб даведацца больш.

...Прыглушанае святло, вокны завешаны чорнымі палотнамі, гараць свечкі... Нават забываеш, што толькі што трапіў сюды з вуліцы, дзе няшчадна паліць сонца. На сцэне рыхтуюцца да выступлення артысты. Аператары настройваюць камеры. Гледачы сядзяць у мяккіх крэслах і чакаюць, якое новае аблічча прыме чарговы сусветна вядомы хіт...

За кулісамі зусім іншая карціна: грымёры заняты сваёй справай, спевакі паўтараюць тэксты песень, а творчая каманда праекта сабралася каля манітораў, дзе трансліруецца карцінка са сцэны. Пакуль не прагучала каманда: «Усе па месцах, пачынаем здымацьі», накіроўваемся да стваральнікаў праекта і распытваем, у чым сутнасць і навізна ідэі.

— Па-першае, мы лічым, што тэлевізійная індустрыя даўно мае патрэбу ў такім праекце. Усё менш можна пачуць, як беларускія артысты спяваюць пад фанаграму. Цяпер трэнд жывога гуку. І ў нашай праграме таксама толькі жывое гучанне — жывая музыка, вакал. Таму гледачы змогуць пачуць, хто і як спявае рэальна. Па-другое, цяпер можна назіраць новы ўздым культуры 1960-1970-х гадоў. У такой сітуацыі слухаць «Ролінг Стоунз», «Бітлз», «Лед Зепелін» і Боба Марлі зноў модна. А яшчэ мы падзяляем пазіцыю, што тэлеканалы павінны выконваць і выхаваўчую функцыю. І ў нашай праграме кожны глядач зможа не толькі пачуць музыку, але і даведацца біяграфіі вядомых выканаўцаў. Згадзіцеся, не ведаць біяграфію «Бітлз» — гэта як не чытаць Дастаеўскага, — расказвае пра ідэю праекта «Легенды. Live» выканаўчы прадзюсар тэлеканала АНТ Міхаіл Бычанок.

Гэта першая забаўляльная цыклавая праграма на тэлебачанні. Яна будзе выходзіць у эфір раз на тыдзень. Кожны выпуск нагадвае такі сабе мікс з музыкі і гісторый жыцця яе стваральнікаў. **Важна адзначыць, што праграма будзе поўнасцю беларускамоўнай.**

— Беларуская мова сёння, можна сказаць, у трэндзе, яна становіцца папулярнай. І наш тэлеканал гэтаму вельмі рады і імкнецца падтрымліваць такую з'яву, — тлумачыць свой ход стваральнікі праграмы.

Мінулі чатыры здымачныя дні і пяць начэй. Здымкі музычных нумароў пачыналіся а палове дзявятай раніцы і заканчваліся гадзін у дзесяць вечара. У падборы выканаўцаў для кавер-версій не абышлося без спрэчак. Каму і якую песню даверыць для выканання — меркаванні наконт гэтага часам разыходзіліся.

— Кожны глядзеў на сітуацыю са сваёй пазіцыі. Міша (Міхаіл Бычанок — **Аўт.**), як прадзюсар, думаў пра тое, як усё лепш арганізаваць. На ім быў увесь адміністрацыйны працэс. Мы з Аляксандрам (Аляксандр Табольскі, музычны кіраўнік праекта — **Аўт.**) глядзелі на задачу з пазіцыі, ці будзе адпавядаць артыст матэрыялу, наколькі камфортна выконваць пэўную кампазіцыю тым ці іншым людзям, — расказвае вядучы праграмы «Легенды. Live» Іван Падрэз. — Не хачу нікога пакрыўдзіць, але не кожны можа зразумець, як спяваць Боба Марлі альбо пераспяваць групу «Нірвана», бо нехта рос зусім на іншай музыцы, а некаму проста падабаюцца розныя стылі музыкі і іх выканаўцы. Таму спрэчкі творчага характару былі, аднак мы змаглі прыйсці да згоды.

Усяго ўвазе гледачоў будзе прадстаўлена 60 кампазіцый, дзе песні тытанаў сусветнай музыкі (такіх, як «The Beatles», «The Rolling Stones», «Pink Floyd», «Queen», «The Doors», Bob Marley, «Песняры», «Верасы», «Машына часу», «Брава», «Чайф» і многіх іншых) будуць выконваць нашы артысты, сярод якіх Аляксандр Ціхановіч, Іскуі Абалян, Ларыса Грыбалёва, Аляксей Хлястоў, Дзядзька Ваня, Валерыя Садоўская, гурты «Без Білета», «Стары Ольса», «Hurma», «Navi», «Tomorrow Too Late», «Дай дарогу».



Тэлевядучы Іван ПАДРЭЗ правёў на здымачнай пляцоўцы ўсе пяць начэй.

— Я проста ў захапленні ад удзелу ў праекце. Буду выконваць дзве кампазіцыі: кавер на «Come Together» групы «Бітлз» і «Love me tender» Элвіса Прэслі, — дзеліцца ўражаннямі ўдзельніца праграмы, спявачка Валерыя Садоўская. — Скажу шчыра, песню «Бітлз» я дагэтуль не чула, таму атрымала каласальны вопыт працы з новым матэрыялам. Было дзе разысціся і паказаць свае адчуванні і ўражанні ад яе. Ты нібыта пераносішся ў той час, і хочацца адпавядаць яго стылістыцы.

1.40 Серыял «Рускія страшылкі».
3.10 Маст. фільм «Член урада».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
17.00 Серыял «Агенты».
18.45 «Тэлемагазін».
19.05 Серыял «Страла».
20.45 «Вечарніца».
21.00 Драма «Каханне да смерці».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.00 «НТБ раніцай».
8.10 «Да суда».
9.10, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
11.30, 14.20, 17.30 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
11.55, 13.20 «Суд прысяжных».
14.40 «Пракурорская праверка».
15.35 «Справа густу».
16.35 Серыял «Масква. Тры вакзалы».
17.55 Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
20.00 Серыял «Брат за брата».
23.30 Серыял «Глухар. Вяртанне».

8 КАНАЛ

7.00, 12.35, 19.00, 20.55, 23.35 «Надвор'е».
7.05, 16.05 Мультпарад.
7.30 Баявік «Ліцэнзія на забойства».
9.45, 17.55 Серыял «Зніклы без вестак».
10.30 «Тваё здароўе». «Дзіцячая стаматалогія».
11.00 Серыял «Лілехамер».
12.40 «Кінаблакнот».
12.50 Меладрама «Блукаючыя зоркі».
15.15, 22.50 Серыял «Да смерці прыгожая».
16.30 «Адшукваецца адпачынак».

СУБОТА, 30 ЖНІЎНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

7.35 Існасць.
8.00, 9.10 Фільм-казка «Папялушка».
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.40, 23.30 Серыял «Сваты 5».
10.50 «Пра яду!».
11.25 Дача.
12.10 Давярай і правярай.
12.50 Ток-шоу «Здароўе».
13.35 Тайны следства.
14.10 Вакол планеты.
15.15 Навіны рэгіёна.
15.30, 0.40 «Вялікая розніца».
16.55 Кінааповесць «Панеенка-сялянка»
19.00 Камедыя «Любовь-морковь 3».
21.00 Панарама.
21.40 Меладрама «Тэрмінова! Шукаю мужа».
0.30 Дзень спорту.

БЕЛАРУСЬ 2

7.20 Маст. фільм «Казка пра страчаны час».
8.45 М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
10.20 Беларуская кухня.
11.05, 21.05 Тэлебарометр.
11.10 «Два з паловай кухары».
11.40, 21.45 Серыял «Універ. Новы інтэрнат».
13.35 Пад грыфам «Вядомыя».
14.35 Баявік «Знайсці забойцу».
18.10 «Comedy Батл. Без межаў».
19.15 Суперлато.
20.05 Пад грыфам «Вядомыя».
20.40 «Кіпень».
21.00 КЕНО.
21.10 Мазгавы штурм.
23.20 Баявік «Вясёлыя канікулы».

БЕЛАРУСЬ 3

8.00, 13.10, 21.00, 23.45 «Калейдаскоп».
8.10 «Заўтра — гэта мы!».
8.40, 13.50, 14.50, 18.10, 18.55 «Размаўляем па-беларуску».
8.45 Серыял. «Мегрэ».
13.20 «Наперад у мінулае».
13.55 «Янка Купала. ...Я аплацыю народу». Дак. фільм.
14.20 «Сад маёй душы». Дак. фільм.
14.55 «АРТіШОК». Гурт «Без білета».
15.20 Канцэрт Акадэмічнага ансамбля песні і танца Расійскай Арміі імя А.В. Аляксандрава.
16.40 «Ціхая застава». Маст. фільм.
18.15 «Магія слова і гуку». Дак. фільм.
19.00 «Рыфмуецца з любоўю». Маст. фільм. 1-я і 2-я серыі.
20.45 Калыханка.
21.10 Сусветнае кіно. «Маленькая чорная кніжка».
22.55 «Іван Масквіцін. Шлях да акіяна». Дак. фільм.

БЕЛАРУСЬ 5

8.10 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Плэй-оф. Матч у адказ. БАТЭ (Беларусь) — «Слован» (Славакія).
10.00 Футбол. Суперкубак Іспаніі. «Атлетыка» (Мадрыд) — «Рэал» (Мадрыд).
11.55 Хакей. Кубак Руслана Салея. Групавы этап.
13.45 Еўрапейскі покерны тур.
14.40 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Бэрнлі» — «Манчэстэр Юнайтэд».
16.55 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Манчэстэр Сіці» — «Сток Сіці».
19.20 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Эвертан» — «Чэлсі».
21.20 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Ньюкасл» — «Крыстал Пэлас».
23.15 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Астан Віла» — «Хал Сіці».

АНТ

7.00 «Суботняя раніца».
8.00, 9.00, 16.00, 20.30 Нашы навіны.
9.05 М/с «Смяшарыкі». Новыя прыгоды.
9.20 «Здароўе».
10.25 «Смак».
11.05 «Ідэальны рамонт».
12.05 «ТБ-таксі».
12.30 «Колькі каштуе кінуць піць».
13.25 «Святлана Кручкова. «Я навучылася проста, мудра жыць...».
14.20, 16.20 Серыял «Вялікая перамена».
16.15, 21.00 Навіны спорту.
19.00 «КВЗ». Прэм'ер-ліга.
21.05 «Паўтары!».
23.15 Маст. фільм «Горад анёлаў».

СТБ

6.25 Серыял «Фірменная гісторыя».
8.00 «Анфас».
8.15 Камедыя «Мае зоркі цудоўныя».
10.00 «Чыстая праца».
11.00 «Уявіце сабе».
11.30 «Мінск і мінчане».
12.05 «Прыгоды дылетанта».
12.40 «Сакрэтныя тэрыторыі».
13.35 Камедыя «Гусарская балада».
15.20 «Ваенная тайна».
16.30, 19.30 «24 гадзіны».
16.45 «Наша справа».
17.00 «Вялікі горад».
17.40 «Такі лёс».
18.35 «Разумней не прыдумаеш».
20.00 «СТБ-спорт».
20.10 Маст. фільм «Выкуп».
22.25 «Зорны рынг». «Залатая калекцыя беларускай эстрады».
23.30 Маст. фільм «Хітрунства».
1.10 «Глядзець усім!».

МІР

5.00 М/ф.
7.35 «Мільён пытанняў пра прыроду».
7.50 «Ой, мамачкі».
8.15 «Эксперыментатары».
8.30 «Мар! Дзейнічай! Будзь!».
9.00, 15.00 Навіны (бягучы радок).
9.10 «Любімыя акцёры».
9.35 Маст. фільм «Прыгоды жоўтага чамаданчыка».
11.00 Маст. фільм «Чарадзейная лямпа Аладзіна».
12.25 Маст. фільм «Залатыя рогі».
13.40 Маст. фільм «Востраускарбаў».
15.10 Серыял «Каралі гульні».
20.40 «Навіны (бягучы радок) культуры».
21.20 Маст. фільм «Выпадковы муж».
23.00 Маст. фільм «Слепата».
1.15 Маст. фільм «Патрыятычная камедыя».
3.20 Маст. фільм «Трактаўшчыца».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 Маст. фільм «Хатняя прыслужніца».
8.50 Маст. фільм «Ціхоня».
10.20 «Ранішняя пошта».
11.00, 14.00, 20.00 Весткі.
11.10 «Суботнік».
11.50 «Планета сабак».
12.25 Серыял «Мора па калена».
14.15 «Пра дэкор».
15.15 «Танкавы біятлон».
16.25 Маст. фільм «Камінны госць».
18.10 «Суботні вечар».
19.55 Надвор'е на тыдзень.
21.00 Маст. фільм «Не было б шчасця-2».
0.15 Маст. фільм «Жонка Шэкспіра».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.25 Серыял «Порах і шрот».
8.00, 10.00, 13.00, 16.00 Сёння.
8.20 «Урачэбныя тайны плюс».
8.50 «Іх норавы».
9.25 «Справа густу».
10.20 «Галоўная дарога».
10.55 «Кулінарны паядынак».
11.55 «Кватэрнае пытанне».
13.25 Серыял «Тры зоркі».
14.15, 16.20 Серыял «Мент у законе-8».
18.05 «Кантрольны званок».
19.00 «Цэнтральнае тэлебачанне».
20.05 Маст. фільм «Маё прозвішча Шылаў».
21.55 «Генерал».
23.00 «Ты не паверыш!».

8 КАНАЛ

9.00, 11.55, 18.55, 21.00, 23.25 «Надвор'е».
9.05 «Мультпарад».
9.25 Серыял «Страла».
11.00 «Даведнік па краінах і кантынентах».
11.10 Серыял «Да смерці прыгожая».
12.00 Прыгоды «Нешта».
13.40 Драма «Каханне да смерці».
15.20, 23.10 «Кінаблакнот».
15.30 «Тэлемагазін».
16.00 «Адшукваецца адпачынак».
16.30 Трылер «Сярод белага дня».
18.05 Серыял «Агенты».
19.00 Драма «Страказа».
20.50 «Вечарніца».
21.05 Меладрама «Чароўнае дзіця».

ВТБ

6.00, 1.00 «PLAY".
8.30 М/ф «Смяшарыкі».
9.00 Серыял «Татавы дочкі».
10.00 «Міксер».
12.00 «Спытайце кухара».
13.00 Серыял «Аманда О».
15.00 Баявік «Ямакасі, або Новыя самураі».
17.00, 0.00 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
17.30 «Уральскія пельмені».
19.00 Серыял «Васьмідзясятыя».
20.30 Фэнтэзі «Незвычайныя прыгоды Адэль».
23.00 Скетч-шоу «6 кадраў».
23.30 «Нерэальная гісторыя».
0.30 «Лаві момант».

КУЛЬТУРА

5.30 «Еўраньюс».
9.00 «Звычайны канцэрт».
9.35 Маст. фільм «Балада пра салдата».
11.00 Вялікая сям'я. Аляксандр Міхайлаў.
11.55 Пернікавы домік. «Рускія падманкі».
12.25 Зорныя партрэты. «Сяргей Крыкалёў. «Чалавек-рэкорд».
12.55, 0.55 Дак. серыял «З жыцця жывёл».
13.45 Да 100-годдзя пачатку Першай сусветнай вайны. Дак. серыял «Нефрантавыя нататкі».
14.15 «Люба, браткі, люба...» Канцэрт Кубанскага казацкага хору.
15.15 Дак. фільм «Вавілонская вежа. Падарожжа па зямлі Папуа».
16.15 105 гадоў з дня нараджэння актрысы. «Фургон камедыянтаў. Лідзія Сухарэўская і Барыс Ценін».
16.50 Маст. фільм «Каін XVIII».
18.25 Канцэрт Алега Пагудзіна ў Дзяржаўным Крамлёўскім палацы.
19.50 80 гадоў з дня нараджэння Анатоля Саланіцына. «Астравы».
20.30 Маст. фільм «Андрэй Рублёў».
23.35 Пол Анка. Канцэрт у Базелі.
0.35 М/ф для дарослых «Фільм, фільм, фільм».
1.50 Дак. фільм «Тамерлан».

НАСТАЛЬГІЯ

5.00 «Міжнародная панарама». 1979 год.
5.50 «Залатая пласцінка-2». Фільм-канцэрт.
6.20 М/ф «Кола фартуны».
6.45, 12.45 Маст. фільм «Ключ».
8.00, 14.00, 20.00, 2.00 «Мінулы час».
9.00, 15.00, 3.00 «Народжаныя ў СССР».
10.00, 4.00 «Дзесяць цяжкіх дарог...». Канцэрт.
11.00 «Здароўе». 1982 год.
11.50 Дак. фільм «Ткачыха».
12.10 «Магчыма ўсё». Канцэрт.
16.00 «Тэма». 1993 год.
16.40, 0.30 Канцэрт замежнай эстрады.
17.00 Дак. фільм «Аляксандр Каверзнеў. Фатальная тэма».
18.00 «Залатая пласцінка». 1985 год.
18.30 Тэлефільм «Следства вядуць ЗнаТаКі».
19.25 «У вольны ад працы час». Фільм-канцэрт.
21.00 «Колба часу».
22.05 «Погляд». 1995 год.
23.00 «Прарокі ў сваёй Айчыне». 1990 год.
0.10 «Білет у Маскву». Канцэрт.
0.50 Маст. фільм «Чарадзейны голас Джэльсаміна». 2-я серыя.

EUROSPORT

4.00, 10.30, 18.45, 22.05, 2.05 Тэніс. Турнір Вялікага Шлема. Адкрыты турнір ЗША.
9.30, 17.00 Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі.
13.30 Конны спорт. Сусветныя конныя гульні.
14.00 Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Лёсаванне.
15.00 Акадэмічнае веславанне. Чэмпіянат свету.
22.00, 2.00 Тэніс. Гейм, сэт і Матс.

КАМЕДЫЯ

5.00, 9.00, 2.10 Серыял «Няўдачнік».
6.00 Камедыя «Мужчына з гарантыяй».
7.25 Камедыя «Адна жанчына або дзве».
10.00 Меладрама «Невыносная жорсткасць».
11.45 Прыгоды «Аперацыя Дэльта Фарс».
13.20, 16.20, 21.00 Серыял «Я і місіс Джонс».
14.20 Прыгоды «Прыкінься маім мужам».
15.55, 18.55, 23.55, 4.45 Скетчком «Паміж намі».
17.20 Камедыя «Дзеля кахання да Мэры».
19.15 Камедыя «Любовь-морковь».
22.10 Камедыя «Оскар».
0.15 Камедыя «Бобро поржаловать».
3.10 Камедыя «Брат і сястра».

ТБ3

6.00 М/ф.
8.25, 14.35 «Доктар І...».
8.55, 18.30, 2.30 Серыял «Цудоўнае стагоддзе».
10.30, 4.25 Дак. серыял «Па справах няпоўнагадовых».
12.15, 17.30 Дак. серыял «Справа Астахава».
13.10, 17.00, 4.00 Дак. серыял «Простыя складанасці».
13.40 Серыял «Мы з будучыні».
15.05, 1.40 Серыял «Тайны следства».
16.00, 22.05 «Зорныя гісторыі».
20.15 Камедыя «Развітальны пацалунак».
22.55 «Гісторыі выратавання».
23.25 Маст. фільм «Сышчык».
0.55 Серыял «Белы каўнерык».

ТБ1000

5.00, 10.40 Камедыя «Жывёла».
6.50 Драма «Скарб».
9.00 Камедыя «Сцюарт Літл 2».
12.30 М/ф «Рабі ногі».
14.30 Камедыя «Ромавы дзённік».
16.40 Драма «Вялікія надзеі».
19.00 Фантастыка «Паралельныя міры».
20.55 Камедыя «Піпец».
22.50 Баявік «Чалавек-павук 3».
1.20 Камедыя «СМСуальнасць».
2.55 Драма «Маленькія жанчыны».

РУССКОЕ КИНО ТВ1000 РУСКАЕ КІНО

6.00 Трагікамедыя «Пяць зорак».
7.55 Камедыя «Канікулы строгага рэжыму».
9.55 Камедыя «Гульня».
11.40 Камедыя «Свята Нептуна».
12.35 Камедыя «Набожная Марта».
15.10 Меладрама «Паралельныя міры».
16.45 Камедыя «Спатканне».
18.20 Камедыя «Вось гэта каханне!».
20.00 Драма «Я таксама хачу».
21.30 Камедыя «Зайцаў, палі! Гісторыя шоўмена».
23.15 Меладрама «Клоўны».
1.20 Драма «Бедуін».
3.10 Камедыя «Лятучая мыш».

NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00 Супербудаванні Трэцяга рэйха.
6.00, 19.00 Зрабі або памры.
7.00, 12.00, 22.00 Навуковыя недарэчнасці.
8.00, 13.00 Сіла племені.
9.00, 14.00 Экстрэмальнае падарожжа.
10.00 Мегазаводы.
11.00 Аўтарэстаўратары.
15.00 Астравы.
16.00 Самыя небяспечныя жывёлы.
17.00, 2.00 Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
18.00 Аўта-SOS
20.00, 0.00, 3.00 Эвакуацыя Зямлі.
21.00, 1.00, 4.00 У чаканні канца свету.
23.00 Турэмныя цяжкасці.

DISCOVERY

7.00 Чыгунка Аляскі.
7.50 Новае жыццё хот-родаў.
8.40, 13.15, 20.35 Як гэта ўстроена?
9.10, 13.40, 20.05, 4.45 Як гэта зроблена?
9.35 Дамы на дрэвах.
10.30, 5.10 Дынама — неверагодны ілюзіяніст.
11.25, 16.25 Ліквідатар.
12.20 Top Gear.
14.10, 3.55 Што ў вас у гаражы?
15.05, 6.05 Махінатары.
16.00 Пятая перадача.
17.20 Дзённікі вялікай вайны.
18.15 Сібірская рулетка.
19.10 Смяротны ўлоў.
21.00 Горад навыварат.
22.00 Скрозь кратовую нару.
23.00 Што было далей?
0.00 Папуляцыя акул II.
0.55 Мегаладон жывы.
1.50 Сапраўдныя аферысты.
2.40 Маланкавыя катастрофы.
3.05 Каралі аўкцыёнаў.

НЯДЗЕЛЯ, 31 ЖНІЎНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

7.20 Камедыя «Любовь-морковь 3».
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 Арсенал.
9.40, 0.05 Серыял «Сваты 5».
10.50 «Пра яду!».
11.25 XXL WOMAN TV.
12.10 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
12.35 «Зона Х».
13.10 Каробка перадач .
13.50 Да 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Дак. цыкл «Яны спявалі за Радзіму». Фільм 10-ы, заключны.
14.25 Дыялогі аб цывілізацыі.
15.15 Твой горад.
15.30 «Зорнае жыццё». «Пакахай сябе такой».
16.35 Давярай і правярай.
17.10 Дэтэктыў «Школа для таўстушак».
21.00 Галоўны эфір.
21.55 Навіны надвор'я.
22.15 Камедыя «Лары Краўн».

БЕЛАРУСЬ 2

7.20 Маст. фільм «Міа, мой Міа».
9.00 М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
10.40 Мазгавы штурм.
11.15, 20.25 Тэлебарометр.
11.20 «Два з паловай кухары. Адкрытая кухня».
11.50, 21.45 Серыял «Універ. Новы інтэрнат».
13.25, 23.20 Дэтэктыў «Метад Фрэйда». 1-я і 2-я серыі.
15.35 Пад грыфам «Вядомыя».
16.10 Баявік «Знайсці забойцу».
18.10 «Comedy Батл. Без межаў».
19.15 Суперлато.
20.45 Калыханка.
21.15 «Блізкія кантакты трэцяга роду». Маст. фільм.
23.50 «Подых струн. Мелодыі лета».

БЕЛАРУСЬ 5

7.20 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Астан Віла» — «Хал Сіці».
9.15 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Эвертан» — «Чэлсі».
11.10 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Бэрнлі» — «Манчэстэр Юнайтэд».
13.00 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Манчэстэр Сіці» — «Сток Сіці».
14.55 Гандбол. SEHA-ліга. «БГК імя Мяшкова» — «Бораць».
16.55 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Тарпеда-БелАЗ» — «Гомель».
18.55 Хакей. Кубак Руслана Салея. Фінал.
21.35 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Тотэнхэм» — «Ліверпуль».
23.30 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Лестэр» — «Арсенал».

АНТ

7.00 «Нядзельная раніца».
8.00, 9.00, 16.00 Нашы навіны.
9.05 Нядзельная пропаведзь (з субцітрамі).
9.20 М/с «Смяшарыкі. ПІНкод».
9.35 «Бесталковыя нататкі».
9.55 «Пакуль усе дома».
10.40 «Фазэнда».
11.10 «ТБ-таксі».
11.35 «Ідэальны рамонт».
12.30 Камедыя «Афоня».
14.10 Драма «Вось я які».
16.15 Навіны спорту.
16.20 Маст. фільм «Зараза».
17.25 «Асяроддзе пражывання».
18.30 «Хвіліна славы».
20.00 Контуры.
21.05 «Дыханне планеты».
21.35 Маст. фільм «Піраммід».
23.30 Драма «Як пазнаць сваіх святых».

СТБ

6.00 Серыял «Фірменная гісторыя».
7.35 «Скардзіцца дазваляецца».
7.55 Маст. фільм «Выкуп».
10.00 «Вялікае сняданне».
10.40 «Тэрыторыя памылак».
12.20 «Прывітанне, доктар».
12.55 «Тайны свету».
13.55 Маст. фільм «Два білеты на дзённы сеанс».
15.45 «Глядзець усім!».
16.00 «Цэнтральны рэгіён».
16.30 «24 гадзіны».
16.50 «Аўтапанарама».
17.20 Канцэрт Міхаіла Задорнава.
18.25 «На тым жа месцы ў той жа час».
19.30 «Тыдзень».
20.40 Драма «Фантомны боль».
22.30 Музычны фестываль «Сяброўства».
23.50 Маст. фільм «8 1/2».

2.10 «Дак. спецпраект»: «Бітва славянскіх багоў», «Бітва закінутых светаў».

МІР

5.00 М/ф.
7.40 «Зямля і неба».
8.05 «Ведаем рускую».
9.00, 15.00 Навіны (бягучы радок).
9.10 «Прыгоды Македонскай».
9.20 «Нітка да ніткі».
9.45, 0.15 Маст. фільм «Каран і Арджун».
13.05 Маст. фільм «Дзве гісторыі пра каханне».
15.10, 21.00 Серыял «Чатыры пары года».
20.00 «Разам».
22.40 Маст. фільм «Розыгрыш».
3.35 Маст. фільм «Музычная гісторыя».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 Маст. фільм «Не было б шчасця-2».
10.10 «Сам сабе рэжысёр».
11.00, 14.00, 20.00 Весткі.
11.15 «Смехапанарама».
11.45 «У свеце жывёл».
12.20, 17.40 М/ф.
13.00 «Асабістая прастора».
14.15 Міжнародны конкурс дзіцячай песні «Новая хваля-2014».
18.10 Маст. фільм «Удачлівая».
21.00 «Нядзельны вечар».
22.40 Маст. фільм «Прыватны дэтэктыў Таццяна Іванова. Вянец бясшлюбнасці».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.25 Серыял «Порах і шрот».
8.00, 10.00, 13.00, 16.00 Сёння.
8.20 «Агляд».
8.50 «Іх норавы».
9.25 «Ядзім дома!».
10.25 «Першая перадача».
11.05 «Цуд тэхнікі».
11.55 «Дачны адказ».
13.20 Серыял «Тры зоркі».
14.20 Маст. фільм «Маё апошняе першае каханне».
16.20 «Паедзем, паядзім!».
17.00 «Следства вялі...».
18.00 Надзвычайнае здарэнне.
19.00 «Сёння. Падагульняючая праграма».
20.10 Маст. фільм «Ельцын. Тры дні ў жніўні».
22.05 Баявік «Карнік».

8 КАНАЛ

9.00, 12.35, 18.45, 20.55, 23.55 «Надвор'е».
9.05, 14.55 «Мультпарад».
9.45 «Тваё здароўе».
10.00 «Адшукваецца адпачынак».
10.30 Драма «Адданы садоўнік».
12.40 Баявік «Від на забойства».
16.30 «Тэлемагазін».
17.30 «VR-дайджэст».
17.55 Серыял «Агенты».
18.50 Баявік «Прафесіянал».
20.45 «Вечарніца».
21.00 Камедыя «Няўлоўны».

ВТБ

6.00, 1.00 «PLAY».
8.30 М/ф «Смяшарыкі».
9.00 Серыял «Татавы дочкі».
10.00 «Міксер».
12.00 «Паспець за 24 гадзіны».
13.00, 0.30 «Лаві момант».
13.30, 23.15 Скетч-шоу «6 кадраў».
14.00 «Кіно ў дэталях».
15.00 Серыял «Васьмідзясятыя».
16.30 Фэнтэзі «Незвычайныя прыгоды Адэль».
19.00 «Уральскія пельмені».
20.30 Прыгоды «Цукру».
23.30 «Нерэальная гісторыя».
0.00 Скетч-шоу «Даеш моладзь».

КУЛЬТУРА

5.30 «Еўраньюс».
9.00 «Звычайны канцэрт».
9.35 Маст. фільм «Каін XVIII».
11.05 «Легенды сусветнага кіно». Эраст Гарын.
11.30 Цырк «Масіма».
12.25 Зорныя партрэты. «Георгій Грэчка. Траекторыя лёсу».
12.55, 0.55 Дак. серыял «З жыцця жывёл». 4-я серыя, заключная.
13.45 «Пешшу...». Масква музычная.
14.15 «Шэдэўры сусветнага музычнага тэатра». Балет Л. Мінкуса «Баядэрка».
16.35 Дак. фільм «Вавілонская вежа. Зямля сумленных людзей».
17.30 «Людзі ідуць па свеце». Канцэрт аўтарскай песні.
18.30, 0.10 «Шукальнікі». «Загадка парку Манрэпо».
19.20 Хрустальны баль «Хрустальная Турандот» у гонар Іны Чурыкавай.
21.10 Маст. фільм «Люстэрка для героя».
23.20 Трыумф джаза.
1.50 Дак. фільм «Кацусіка Хакусай».

НАСТАЛЬГІЯ

5.00 Дак. фільм «Аляксандр Каверзнеў. Фатальная тэма».
6.00 «Залатая пласцінка». 1985 год.
6.30 Тэлефільм «Следства вядуць ЗнаТаКі».
7.25 «У вольны ад працы час». Фільм-канцэрт.
8.00, 2.00 «Мінулы час».
9.00 «Колба часу».
10.05 «Погляд». 1995 год.
11.00 «Зоркі польскай эстрады». Канцэрт.
12.00 «Бліц». 1990 год.
12.35 «Сузор'е Нікі». 1993 год.
13.50 «Добры вечар, Масква! Шоу-дасье». 1991 год.
15.10, 4.40 Канцэрт замежнай эстрады.
15.30 Маст. фільм «Небяспечны ўзрост».
17.00 «Брэйн-рынг». 1990 год.
17.50 «Шчаслівы выпадак». 1994 год.
18.35 «50/50». 1991 год.
19.50 «Сустрэчы для вас». 1994 год.
20.35 «Знак пытання». 1990 год.
21.00 «Тэатральныя сустрэчы». 1985 год.
22.05 «Пакуль усе дома». 1992 год.
22.35 «Спявае ВІА «Сіняя птица». 1979 год.
23.00 «Здароўе». 1982 год.
23.50 Дак. фільм «Ткачыха».
0.10 «Магчыма ўсё». Канцэрт.
0.45 Маст. фільм «Ключ». 2-я серыя.
3.00 «Народжаныя ў СССР».
4.00 «Тэма». 1993 год.

EUROSPORT

4.00, 11.00, 18.45, 22.05, 2.05 Тэніс. Турнір Вялікага Шлема. Адкрыты турнір ЗША.
9.30, 16.30 Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі.
10.30 Ралі. ERC Чэхія.
12.30 Конны спорт. Сусветныя конныя гульні.
14.00 Акадэмічнае веславанне. Чэмпіянат свету.
15.45 Веласпорт. Гран-пры.
22.00, 2.00 Тэніс. Гейм, сэт і Матс.

КАМЕДЫЯ

5.00, 8.55, 13.40, 2.10 Серыял «Я і місіс Джонс».
6.00 Прыгоды «Аперацыя Дэльта Фарс».
7.25 Камедыя «Дзеля кахання да Мэры».
9.55 Камедыя «Оскар».
11.45 Камедыя «Любовь-морковь».
14.40 Прыгоды «Астэрыкс на Алімпійскіх гульнях».
16.35 Серыял «Месяцовы хлопчык».
17.25 Камедыя «Любовь-морковь 2».
19.20 Камедыя «Ба

■ Хто каго?

«ГОСЦЯ Ў ГОРАДЗЕ ПРЫМАЛІ, ДЫВАНАМІ ПЛІТКУ ЎСЛАЛІ...»

«У нядзелю разам з жонкай паехалі на лецішча — забіраць дзяцей. Самым першым насустрач нам выбег шчаслівы дзядуля».

Добры анекдот, праўда? Ці ўсё ж запіс з дзённіка бацькі? Калі так — вітайма! І тое, што ў дзяцей так многа ёсць (бацька, дзядулі, бабулі, лецішча...), і тое, што вельмі шмат застанецца — дзякуючы дзённіку: у прыватнасці, мілых сэрцу гісторый, мілых падзей і мілых слоў, якімі так цешаць малыя, пакуль падрастуць. Ну вось напрыклад. «Мама, хутчэй сюды! — просіць чатырохгадовая дачушка.— Па тэлевізары пра нашага Глеба гавораць!» «Што пра яго могуць гаварыць? — не разумее маці.— Малому два месяцы». Але ж да тэлевізара падыходзіць. «Тут толькі што сказалі,— тлумачыць дачка,— што на глебе — замаразкі».

З той жа сямейкі яшчэ адзін дыялог. «Дождж ідзе...» — заўважае мама, глянуўшы ў акно. Дачушка, падбягаючы: «Куды? Да нас?!»

Даждж — узгадайма — сёлетнім летам шмат дзе чакалі! Месцамі, як сведчыць здымак (глянулі на верхні?), нават дарожку паслалі! Як найлепшаму госцю! Вось дождж туды і прыйшоў...

Ці ўсё ж такі не ён?

Як заўсёды, колькі аўтараў у конкурсу на лепшы подпіс да здымка — столькі меркаванняў. Ад **спадара Мікалая Старых з Гомеля:**

Чына важнага прымалі,
Уміг дарожку разаслалі...
Паспяшылі мужыкі:
Колер — яўна не такі.
— Трэба —
як у Галівудзе,—
Мовіў чын...
— Дык так і будзе!

Гэту, значыць, скруцім, новую пад ногі кінем...

Хто б у тым сумняваўся,— **спадарыня Валянціна Гудачкова з Жыткавічаў** — не:

Госця ў горадзе чакалі,
Дыванамі плітку ўслалі:
Ён прайшоў —
нібыта князь...
І пляваць, што далей грязь.

З тога ж канверта і досыць мудрае назіранне:

Тым, хто ідзе па дыванах,—
І цікавасць, і пашана,
Гледачы стаяць ўздоўж...
А па мне дык лепей сама
Па зямельцы... Басанож.

«Бо яна, зямелька,— самая мудрая і самая справядлівая,— піша Валянціна Апанасаўна.— Яна кожнаму дае па працы яго. Я вось шчырую з самага ранку да позняга вечара. Цяжка, здавалася б? Так. Але як добра потым бачыць плён: кашамі збіраць садавіну-гародніну, любавацца кветкамі, слухаць, як на дрэвах пяюць-заліваюцца птушкі, пахнуць ягады... Ну чым не рай?

Дарэчы,— працягвае спадарыня Валянціна,— любімы ўсімі Пушкін пісаў, што на свеце ёсць дзве галоўныя прафесіі: земляроб і паэт».

Не ведаем, ці шмат земляробаў сярод паэтаў, а вось паэтаў сярод земляробаў... Асобным з іх (у тым ліку **спадарыні Любові Чыгрынавай з вёскі Забалацце Вілейскага раёна**) варта вокам на здымак кінуць, каб выдаць:

На «Дажыначках» дарожка
Паспытала славы трошкі.
А пасля пачэснай працы —
У калідор адміністрацыі...
Тут ёй гонар не такі,
Тут другія хадакі:
Часам гэткі йдзе разнос,
Што, здаецца,
Дыбкі ворс!

Але ж і без іх, без гэтых разносаў, як піша **спадар Анатоль Гарачоў з вёскі Даўнары Іўеўскага раёна,** таксама нельга:

Калі заваліш, браце, план,
Дык так цябе і прывітаюць:
Альбо паклічуць «на дыван»,
Альбо «ў асфальце
закатаюць».

І гэта, на думку **спадарыні Соф'і Кусянковай з вёскі Лучын Рагачоўскага раёна,** вядома ж, не ўсё, што могуць зрабіць:

Як ні пяўся наш Ягор —
Справу завалілі...
Дыванок
з-пад ног яго
У трубу скруцілі...
І пазбавілі ураз
Цёпленькага крэсла...
Чаму служка яшчэ і... рад:
Ад турмы ж пранесла!

А, напэўна, варты быў? Калі сапраўды «заваліў справу», калі...

Тут — прозай: «Гады са тры таму,— піша **спадарыня Н.** (прозвішча і зваротны адрас паведамляліся не для друку),— у перадавікі ў нас «выбіўся» адзін механізатар, што нікога і не здзіўляла, бо старэйшая сястра яго працавала ў нашай канторы намесніцай дырэктара. А таму, пачынаючы з пасяўной, у яе брата было ўсё, прычым самае найлепшае: і тэхніка, і запчасткі, і поле... Іншыя механізатары гэта, вядома ж, бачылі, але нікому нічога не казалі, аж пакуль той брат падчас жніва не стаў высыпаць у самазвалы няпоўныя бункеры. А сыпалі ж яны ўдвух... Вось у таго, другога, цярпенне і лопнула. Узняўся ён на мосцік камбайна і аплявушыў лідара так, што ён на зямлю скаціўся... Але ж потым на ногі ўстаў. І на «Дажынкі» ўсё роўна паехаў...

Я пасля гэтага папыталася ў бацькоў,— працягвае чытачка,— ці было нешта такое раней? Адказалі, што было, што даставалася і Кастусю, і Барыску...» Атрымліваецца, што ўсё цячэ, а вось да лепшага мяняецца вельмі нямногае».

Адкуль і радкі ў **спадарыні Н:**

На дарожцы — камбайнёры:
Кожны зух... Насы ўгору...
Нездарма, бо што ні май,—
Старт
у бітве
за ўраджай:
Дзеля умалотаў важкіх,
Хтось працуе шчыра,
цяжка...
Ну а нехта — вёрткі, слізкі...
У пераможцах —
за прыпіскі.

Значыць, і на конкурсным здымку (мае рацыю **спадарыня Любоў Чыгрынава**), і наогул па жыцці

Сітуацыя не з новых —
Як у байцы ў Крылова:
Хтосьці — каціць,
Хтосьці — пхае,
Нехта — збоку назірае:
Яму нельга спіну горбіць,
Ён пільнуе, каб не спёрлі.

Гэта, вядома ж, здараецца. Сярод белага дня і пры людзях, на жаль, таксама. (Расказвалі, у кабінет да аднаго вялікага начальніка падчас шматлюднай нарады зазірнуў хлопец у акуратным рабочым камбінезоне. Сказаў: «З вашага дазволу я тэлефоны праверу?» Папытаўся так, апараты згроб і спакойна вынес... У невядомым кірунку. Хто на што вучыўся, як той казаў. І, напэўна ж, пра людзей дарослых, бо ў маленстве...

Вучыцца кожны быў гатоў,
Бо ўсё ж навука —
гэта база...
Ажно адзінаццаць гадоў
Амаль паўсюль
былі мы разам!
А тут — світанне,
Бераг рэчкі:
«Згарнуўся» баль,
Патухлі свечкі,—

піша **спадар Анатоль Гарачоў.** А далей — дадае (ад імя вартаўніка ці што?):

Не здабыць дыпломы
дзеткам,
Асабліва ў нашы дні:
І на тое, і на гэта —
Ўсюды грошыкі гані.

Адно суцяшае (дурань думкай багацее), што дзеткі потым атрымаюць дыпломы, пойдуць працаваць, зарабляць і ўсё вернуць. Магчыма, нават стакроць!

Сумна жыць, калі ў гэта не верыць. Тым больш што прэцэдэнты такія (ну калі затраты кампенсаваліся) і былі, і ёсць. **Спадар Валерый Гаўрыш з Чавусаў,** паглядзеўшы на чарговы конкурсны здымак, «пачуў», прынамсі, размову мужчын. Той, што падыходзіць ззаду (кінулі вокам?) пытаецца ў пярэдніх:

— І куды гэта рванулі
Жонкі, дочкі і бабулі?
— На канцэрт!..
Міхайлаў... Стас
Завітаў ужо й да нас!

Трэба разумець, будзе выступаць зараз недзе ў Доме культуры, пад дахам. Тут жа, на плошчы, як піша **спадарыня Гудачкова:**

Скончылася свята,
Зніклі карагоды,
Дыванок скруцілі
Да другой нагоды.

І, трэба разумець, яна, тая нагода, чакаць сябе не прымусіць, бо

Нашы людзі не бядуюць —
То спяваюць, то танцуюць.
Каб не паслізнуліся —
Дываны па вуліцах!

Што, вядома ж, лагічна, бо пра тэхніку бяспекі клапаціцца трэба, пра здароўе — таксама: каб ніхто не пацярпеў, каб прайшоў свой шлях да канца. А ўжо якім будзе фініш, што каго там чакае — таямніца.

Кропля святла хіба ў **спадара Гарачова:**

Пасля далёкае дарогі
(Ісці па ёй не ў навіну)
Паслаць дыван гатоў
нямногім,
Затое многім — барану.

Вартых такой вось сустрэчы (з бараной) сярод удзельнікаў звяздоўскага конкурсу на лепшы подпіс да здымка, вядома ж, няма. А вось прэтэндэнты на галівудскі чырвоны дыван — ёсць. На думку чытачоў, найлепшыя подпісы да папярэдняга здымка (на ім, нагадаем, адзін кіроўца спаў перад машынай, а другі — у кабіне. «Звязда» 12 ліпеня) прапанавалі **спадары Анатоль Гарачоў з Іўеўшчыны, Віктар Трайкоўскі і сужэнцы Астроўскія з Мінска, спадарыні Любоў Чыгрынава з Вілейшчыны, Ніна Бурко з Бярэзіншчыны, Ірына Ермаковіч з Браслаўшчыны і Софья Кусянкова з Рагачоўшчыны.**

Вось з гэтым апошнім меркаваннем пагадзілася і журы маленькае, рэдакцыйнае. А значыць, прыз у выглядзе падпіскі на любімую «Звязду» накіроўваецца ў вёску Лучын Рагачоўскага раёна.

Хочаце, каб да вас? Тады ўважліва паглядзіце на ніжні здымак, падумайце, што б гэта значыла, і напішыце (подпісаў можа быць некалькі, але кожны не больш, чым па восем радкоў). Потым вам застанецца толькі ўважліва перачытаць тое, што атрымалася (праверыць, ці не трапілі ў вершы слоўцы з іншай мовы), і даслаць іх у рэдакцыю на конкурс «Хто каго?».

Цалкам магчыма, што пераможаце ў ім менавіта вы. Поспехаў!

Валянціна ДОЎНАР

Фотаздымкі Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Нефармат

Спі дома

Жыла-была сям'я ў невялікай палескай вёсцы. Усё, здавалася б, ёсць: свой дом, абсталяваны добрай мэбляй і тэхнікай, машына. Ніколі не лічыліся маладыя яшчэ муж з жонкай п'яніцамі або лайдакамі, паміж сабой жылі дружна. Прынамсі, скандалаў ці сварак суседзі не памятаюць. Сынок іх сёлета перайшоў у другі клас. Як і ўсе дзеці, любіць камп'ютарныя гульні, але і ў футбол з равеснікамі ганяе. І ўсё было добра ў іх, пакуль аднойчы ўрач не прызначыла дзіцяці аналіз крыві.

Потым, нічога не кажучы бацькам, медыкі накіравалі хлопчыка на новыя аналізы. Дыягназ канчаткова пацвердзіўся (для бацькоў ён прагучаў нібы гром сярод яснага неба): у сямігадовага дзіцяці СНІД. Наступным крокам, вядома, стала абследаванне бацькі і маці малога. Абое яны аказаліся носьбітамі віруса СНІД. Потым сталі разбірацца, успамінаць усю сямейную гісторыю. Аказалася, яшчэ да нараджэння сына галава сям'і ездзіў на заробкі ў Расію, там і падхапіў гэтую небяспечную інфекцыю.

Але, паводле ацэнкі медыкаў, добра тое, што вірус у хлопчыка выявілі ў такім раннім узросце. Яму прызначаная антырэтравірусная тэрапія. І калі ён будзе прымаць прэпараты рэгулярна і не адступіць ад схемы, прызначанай урачом, то можа пражыць доўгае жыццё, у якім будзе месца і адукацыі, і працы, і сям'і. З бацькамі хлопчыка сітуацыя больш складаная. Поспех падтрымкі іх лякарствамі залежыць ад стану імуннай сістэмы кожнага. Але пры правільным і рэгулярным лячэнні яны ўсё-такі маюць шанц убачыць унукаў. Вось толькі як справіцца сям'я з такой цяжкай ношай, невядома.

— А ўсё магло б быць інакш,— гаворыць спецыяліст абласнога Цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Дзмітрый Аляхновіч,— калі б мужчына, які дазволіў сабе рызыкоўныя паводзіны на заробках, здаў аналізы пасля прыезду. Абследавацца на СНІД цяпер можна ананімна ў любой паліклініцы. Гэта, здавалася б, усе павінны ведаць. Але абследуюцца нямногія. Чаму? Нізкі агульны ўзровень культуры, вечнае спадзяванне на тое, што пранясе?..

За мяжой, у заходніх краінах і Амерыцы, удалося стабілізаваць сітуацыю, гавораць спецыялісты. Проста там людзі больш адказна ставяцца да свайго здароўя і паводзін. І вынік ёсць. Што ўжо казаць пра іх узровень абароны ад СНІДу, калі скандальна вядомаму заснавальніку партала WikiLeaks Джуліяну Асанжу ў віну ставіцца тое, што ён меў зносіны з нейкімі жанчынамі без прэзерватыва. Не будзем браць да ўвагі палітычны аспект справы, ды і камічны (кабеты ўспомнілі пра гэта ледзь не праз дзесяць гадоў). Але з інфармацыі вынікае, што сам факт такіх сексуальных паводзін у некаторых краінах Еўропы лічыцца правапарушэннем. А можа, гэта і правільна?

Інакш як, калі не спыніць, дык хаця б запаволіць распаўсюджванне гэтай навалы па свеце? Вопытныя медыкі кажуць, што цяпер у групе рызыкі практычна ўсе. У Брэсце не так даўно з каварным захворваннем выяўлены пенсіянер. А ўжо аматары падзарабіць грошай на прасторах вялікай Расіі становяцца сапраўдным галаўным болем для адпаведных аддзяленняў медыцынскіх устаноў. На будоўлі суседняй краіны едуць, як правіла, маладыя, здаровыя мужчыны. Некаторыя з іх, акрамя грошай, прывозяць у сям'ю цяжкую невылечную хваробу. Такія факты толькі за апошні час выяўлены ў Брэсце, Баранавічах, Іванцэвіцкім, Ганцавіцкім, Столінскім раёнах.

Потым, як правіла, прыходзіць запозненае раскаянне...

Дарэчы, пры вялікім жаданні і пры наяўнасці сілы можна было б і тут грошы зарабіць,— напрыклад, пабудаваць цяпліцу ці заняцца вырошчваннем клубніц альбо кавуноў... У рэшце рэшт і на будоўлі чалавек з рукамі заўсёды цэніцца. Ды і ніякія грошы не варты ўласнага здароўя і трагедыі ўсёй сям'і. Але гэта так, да слова...

Нядаўна ў Брэсце ад СНІДу памёр 41-гадовы мужчына. Без бацькі засталіся трое дзяцей...

Святлана ЯСКЕВІЧ

■ Здарэнні

Крымінальнае бязмежжа

Злачынцы ў масках з самаробнымі бейсбольнымі бітамі трымалі ў страху вяскоўцаў двух раёнаў

Першую чорную справу яны ўчынілі ў Бешанковіцкім раёне. Уначы ўварваліся ў дом, пабілі мужа і жонку. Забралі грошы, ювелірныя ўпрыгажэнні... Гаспадар ад атрыманых траўмаў памёр, жанчыну доўгі час лячылі.

Праз тыдзень яны ж учынілі аналагічнае ў Віцебскім раёне. Таксама ноччу ў масках з проразямі для вачэй і рота, з драўлянымі палкамі ў руках, выставіўшы аконную шыбу веранды, праніклі ў дом. Гаспадара настолькі моцна збілі, што ён праз тыдзень памёр у бальніцы. Скралі грошы, залатыя ўпрыгажэнні і мабільны тэлефон...

Ужо на першапачатковым этапе расследавання ўстанавілі, што зламыснікі перад учыненнем злачынства вельмі добра да яго рыхтаваліся. У прыватнасці, рабілі з дрэва «біты», прадметы маскіроўкі. Шукалі дамы, у якіх, на іх думку, маглі быць значныя грашовыя зберажэнні.

— Пры гэтым у абодвух выпадках абвінавачаныя памыліліся ў сваіх здагадках і здзейснілі напады на дамы, дзе жылі сем'і сярэдняга дастатку,— расказала «Звяздзе» **Іна ГАРБАЧОВА, афіцыйная прадстаўніца ўпраўлення Следчага камітэта па Віцебскай вобласці.**

Былі затрыманыя двое мужчын, 1973 і 1976 гадоў нараджэння, якія раней сумесна адбывалі пакаранне за здзяйсненне карыслівых злачынстваў.

Згодна з адпаведнымі артыкуламі Крымінальнага кодэкса гэтым рабаўнікам і забойцам «свеціць» да 15 гадоў пазбаўлення волі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

За распаўсюджванне маку — 123,5 млн штрафу

Суд Фрунзенскага раёна Мінска вынес пастанаўленне ў дачыненні да распаўсюджвальнікаў опіумнага маку: штраф у памеры 123,5 мільёна рублёў непасрэдна прадаўцу і канфіскацыя аўтамабіля ў яго хаўрусніка, які перавозіў мак.

27-гадовыя непрацуючыя мінчане былі затрыманы раней на вуліцы Д. Сердзіча, з «Аўдзі-80» было канфіскавана 15 кілаграмаў насення маку. Як паведамілі ў МУС, гэтыя грамадзяне цягам доўгага часу займаліся рэалізацыяй «тавару» нарказалежным на тэрыторыі сталіцы.

З моманту ўступлення ў сілу Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 студзеня 2014 года № 1 «Аб некаторых пытаннях дзяржаўнага рэгулявання абарачэння насення маку» супрацоўнікі міліцыі канфіскавалі больш за 43,5 тоны маку. За парушэнне заканадаўства складзена 114 адміністрацыйных пратаколаў у дачыненні да 98 грамадзян. Накладзены штрафы на суму больш за 980 мільёнаў рублёў, канфіскавана дзевяць аўтамабіляў.

МУС нагадвае, што фізічным асобам забараняецца захаванне і перамяшчэнне па тэрыторыі краіны насення маку вагой больш за два кілаграмы або здзяйсненне любых здзелак з не расфасаваным у спецыяльную ўпакоўку насеннем.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Папаўся на спайсе

Супрацоўнікі падраздзялення па наркакантролі ўпраўлення ўнутраных спраў Мінаблвыканкама падчас адпрацоўкі асоб, якія ўжываюць наркотыкі, выйшлі на распаўсюджвальніка спайсаў — 21-гадовага мінчаніна.

У маладога чалавека выяўлена і адабрана каля 800 грамаў (а гэта прыкладна 1600 разавых доз) гатовай да ўжывання курыльнай сумесі, якая мае ў сваім саставе псіхатропнае рэчыва AB -PINACA. Атрута выраблялася ў спецыяльна арандаваным для гэтага гаражы з тытуню і псіхатропнага рэчыва. Яго мінчанін заказваў праз інтэрнэт і забіраў у «закладках». Такім жа чынам ён і збываў сваю прадукцыю. Зносіны з прадаўцом псіхатропу і пакупнікамі курыльных сумесяў вяліся праз Skype, а разлікі — з дапамогай сістэмы электронных грошай Easy Pay. Выключэнне хлопец рабіў толькі для сваіх добрых знаёмых, якім прадаваў зелле пры асабістай сустрэчы.

У дачыненні да затрыманага Заводскім раённым аддзелам Следчага камітэта г. Мінска заведзена крымінальная справа за незаконны абарот наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў і іх прэкурсораў. Гандляру пагражае да 13 гадоў пазбаўлення волі.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

■ Насустрач школе

Максімальная ўвага

Дзяржаўтаінспекцыя запатрабавала ліквідаваць парушэнні на вулічна-дарожнай сетцы каля школ і дзіцячых садоў Мінска да 28 жніўня.

Фота БЕЛТА.

«У выніку рэйдавых мерапрыемстваў кіраўніцтву школ і адміністрацый раёнаў дадзены загады на ліквідацыю прычын адміністрацыйных правапарушэнняў і ўмоў, якія садзейнічаюць іх здзяйсненню»,— паведаміла БЕЛТА **кіраўнік прэс-службы ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама Таццяна ХАРЛІНСКАЯ.**

У асноўным выяўленыя парушэнні звязаны з прапускным рэжымам, прыпынкам і стаянкай транспарту, асвятленнем пешаходных дарожак.

У ДАІ звярнулі ўвагу, што цяпер дзеці вяртаюцца з лагераў, з вёсак, дзе адвыклі ад інтэнсіўнага транспартнага патоку. «Задача ўсіх удзельнікаў дарожнага руху — быць максімальна ўважлівымі да дзяцей. Чужых дзяцей на дарозе не бывае, таму ад вашага неабыякавага ўдзелу залежаць іх здароўе і жыццё»,— падкрэслілі ў Дзяржаўтаінспекцыі.

З 25 жніўня па 5 верасня ў Беларусі пройдзе спецыяльнае комплекснае мерапрыемства «Увага — дзеці». У ходзе акцыі супрацоўнікі ДАІ будуць праводзіць як рэйдавыя мерапрыемствы па выяўленні парушэнняў правілаў дарожнага руху, так і прафілактычныя: інспектары наведаюць працоўныя калектывы і правядуць прафілактычныя акцыі для дзяцей і іх бацькоў. Кіроўцам падчас правядзення комплекснага мерапрыемства днём рэкамендуецца рухацца з уключаным блізкім святлом фар. З пачатку навучальнага года для выканання мераў бяспекі дзяцей супрацоўнікі ДАІ ў ранішні час будуць дзяжурыць каля школ. Усе аўтамабілі, прыпаркаваныя каля школьных тэрыторый з парушэннямі правілаў прыпынку і стаянкі, будуць эвакуяваны.

ДУМАЦЬ НЕ ТОЛЬКІ ПРА СЯБЕ, АЛЕ І ПРА ЭКАЛОГІЮ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Веласіпед — яшчэ адзін дзейсны спосаб разгрузіць горад ад аўтамабіляў. За апошнія гады ён стаў ледзь не часткай іміджу, а калі дадаць, што гэты від транспарту, умоўна кажучы, бясплатны і, да таго ж, экалагічны,— цаны яму няма.

Экалагі прапануюць рэкламаваць менавіта рэгулярны карпул — гэта пастаянныя паездкі на працу ці вучобу. У сярэднім па Мінску можна дабрацца да месца прызначэння за 5–10 тысяч рублёў.

— У сярэднім веласіпед акупляецца за 18 месяцаў,— адзначыў супрацоўнік энергетычнай праграмы Цэнтра экалагічных рашэнняў Павел ГАРБУНОЎ.— Што датычыцца хуткасцяў, то на невялікіх адлегласцях ён «абганяе» аўтамабіль і не стаіць у заторах. Веламаратары зрабілі калькулятар, на якім можна будзе падлічыць свае расходы на праезд у грамадскім транспарце і на веласіпедзе. Праблемы, якія хвалююць веласіпедыстаў,— адсутнасць веладарожак, канфлікты з пешаходамі, неадукаванасць у пытаннях Правілаў дарожнага руху. Тым не менш у вялікіх арганізацыях назіраецца тэндэнцыя да перасоўвання менавіта на веласіпедзе, а не на аўтамабілі.

Скінуцца на паліва

Альтэрнатывай веласіпеду ў Беларусі можа стаць карпул — сумеснае выкарыстанне ўласнага аўтамабіля для перавозак. Знайсці спадарожніка можна з дапамогай спецыяльных сайтаў — такая практыка ўдала дзейнічае ў Еўропе. Звычайна ўласнік машыны прапануе падзяліць са спадарожнымі выдаткі на паліва і ўтрыманне машыны. Гэта дазваляе камфортна і бюджэтна перасоўвацца, не выкарыстоўваючы лішняга транспарту. Адзін з распрацоўшчыкаў сайта carpool.by Юрый КАЗЛОЎ заўважыў, што першымі «дзяліцца» сваімі аўто сталі амерыканцы падчас Другой сусветнай вайны.

Увогуле існуюць тры кірункі карпулу. Класічны — знайсці спадарожнікаў на адну паездку і на вялікую адлегласць. Дынамічны — на меншую адлегласць. Экалагі прапануюць рэкламаваць менавіта рэгулярны карпул — гэта пастаянныя паездкі на працу ці вучобу. Па словах Юрыя Казлова, у сярэднім па Мінску можна дабрацца да месца прызначэння за 5–10 тысяч рублёў. Даехаць з камфортам з Мінска да Мазыра можна за 24 тысячы. Часцей за ўсё беларускія карпульшчыкі жадаюць дабрацца да Мінска, Масквы, Вільнюса, Санкт-Пецярбурга.

Для адной вялікай арганізацыі быў прапанаваны варыянт карпаратыўнага карпулу. «З 1200 супрацоўнікаў каля 800 маюць уласныя аўто, сама фірма знаходзіцца за кальцавой, а паркінг разлічаны на 300 месцаў,— распавядае Юрый Жбанкоў.— Мы падказалі ім «дзяліцца» машынамі — і гэтая практыка ўдала прыжылася сярод калег».

У сярэднім веласіпед акупляецца за 18 месяцаў. Што датычыцца хуткасцяў, то на невялікіх адлегласцях ён «абганяе» аўтамабіль і не стаіць у заторах.

Асноўнымі праблемамі карпулу ў Беларусі з'яўляюцца недавер і нягнуткасць маршрутаў. Да таго ж мала хто ведае, што праз інтэрнэт можна знайсці сабе спадарожніка. Але ўжо зараз на сайце — каля сотні актуальных паездак па Беларусі і ў бліжэйшыя краіны.

Эколагі нагадалі, што з 16 па 22 верасня ў Беларусі пройдзе тыдзень мабільнасці. У рамках гэтай акцыі будуць папулярызавацца экалагічныя віды транспарту. Завершыць яго ўжо традыцыйны «дзень без аўто»: беларускім аўтаўладальнікам прапануюць на дзень адмовіцца ад свайго жалезнага сябра.

Кацярына РАДЗЮК.

Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

Калі Мінск дачакаецца такіх жа стаянак для веласіпедаў, як, напрыклад, у Швецыі?

■ З жыцця кантрабандыстаў

«ПЕРАХАПІЛІ» 16 ТОН ЦЫГАРЭТ

Супрацоўнікі Мінскай рэгіянальнай мытні выявілі буйную партыю цыгарэт айчыннай вытворчасці без акцызных марак і адпаведных дакументаў. Літоўскі перавозчык перамяшчаў, як было пазначана ў іх, цыгарэты з фільтрам агульнай вагой больш за 16 тон з тэрыторыі Літвы транзітам праз тэрыторыю Мытнага саюза. Аднак пасля міжнародных запытаў на адрас кампаніі-адпраўшчыка было ўстаноўлена, што ніякіх дагаворных адносін паміж ёй і атрымальнікам няма. Ды і мытным органам пры транспартаванні тавару былі прадстаўлены не адпаведныя сапраўднасці дакументы. Груз коштам амаль у 4,5 мільярда беларускіх рублёў канфіскаваны. Па факце праводзіцца далейшая праверка.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Ведай нашых!

З ГРАВІТАЦЫЯЙ РАЗАБРАЛАСЯ: ПРЫВЕЗЛА «СЕРАБРО»

Дзесяцікласніца Ліцэя БДУ Настасся Капінская заваявала сярэбраны медаль на 8-й міжнароднай алімпіядзе па астраноміі і астрафізіцы ў Румыніі.

У склад беларускай каманды ўвайшлі таксама навучэнец гімназіі №1 з Ліды Сяргей Бірыч, навучэнец сталічнага ліцэя № 2 Дзмітрый Міхайлаў і выпускнікі гродзенскай гімназіі № 3 Антон Кедук і Яўген Протас. Усе яны перамаглі на рэспубліканскай алімпіядзе і ўвайшлі ў пяцёрку наймацнейшых у нашай краіне. Але на міжнароднай алімпіядзе ім трохі не хапіла вопыту і шанцавання...

У адрозненне ад міжнародных алімпіяд па матэматыцы або фізіцы, алімпіяда па астраноміі складаецца з трох тураў: тэарэтычнага, практычнага, які ўключае аналіз даных, атрыманых прафесійнымі астранамамі, і назіральніцкага. На апошнім этапе спаборніцтваў школьнікам давялося працаваць у планетарыі і пад адкрытым небам. Удзельнікам прапаноўваліся заданні на распазнаванне зорак, сузор'яў, туманнасцяў і г.д.

Падрыхтоўкай беларускай зборнай да спаборніцтваў займаліся дацэнт кафедры тэарэтычнай фізікі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С.Пушкіна Станіслаў Секяржыцкі і выкладчык астраноміі Ліцэя БДУ Аляксандр Паплаўскі. Па словах Аляксандра Паплаўскага, у гэтым годзе алімпіядныя заданні былі даволі складанымі і адначасова вельмі цікавымі, не падобнымі на традыцыйныя, з прыгожым тэкставым афармленнем. Напрыклад, у адной з задач касманаўту, які знаходзіцца ў адкрытым космасе, неабходна было пры дапамозе ёмістасці з вадой і вадзяной пары, стварыўшы рэактыўны струмень, вярнуцца назад у касмічны карабель.

Але бадай што галоўным сюрпрызам можна лічыць філалагічную падрыхтоўку сярэбранага прызёра міжнароднай алімпіяды ў Румыніі Настассі Капінскай. У Ліцэй БДУ дзяўчына паступала год таму як пераможца алімпіяды па беларускай мове. Але сустрэча з таленавітым педагогам, памножаная на вялікую працаздольнасць і імкненне да перамогі, прывялі Настассю да сярэбранай узнагароды на міжнародных спаборніцтвах па «няпрофільнай» для яе дысцыпліне.

Наступная міжнародная алімпіяда па астраноміі і астрафізіцы пройдзе ў жніўні 2015 года ў Інданезіі.

Надзея НІКАЛАЕВА

■

■ Крымінал

Зламыснік распаўсюджваў наркотыкі сярод салдат

Пракуратура Мінскай вобласці санкцыянавала заключэнне пад варту дваццацігадовага жыхара горада Барысава. Ён абвінавачваецца ў распаўсюджванні спайсаў. Пра гэта паведаміў намеснік пракурора Мінскай вобласці, старшы саветнік юстыцыі Аляксандр Беліцкі.

Падчас папярэдняга расследавання па крымінальнай справе стала вядома, што малады чалавек збываў асабліва небяспечнае псіхатропнае рэчыва ў воінскай часці салдатам, якія праходзяць тэрміновую службу. Цікава, што зусім нядаўна сам зламыснік працаваў тут поварам.

Маладому чалавеку прад'яўлена абвінавачванне па частцы 3 артыкула 328 Крымінальнага кодэкса Беларусі. Гэта — незаконны збыт наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў або пракурсораў і іх аналагаў на тэрыторыі ўстановы адукацыі, арганізацыі аховы здароўя, воінскай часці, папраўчай установы, арыштнага дома, у месцах утрымання пад вартай або ў месцы правядзення масавых мерапрыемстваў.

Дзеянні правапарушальніка прадстаўляюць павышаную небяспеку для грамадства і, адпаведна, караюцца пазбаўленнем волі тэрмінам ад 8 да 13 гадоў. Суд можа таксама прымяніць дадатковае пакаранне — канфіскацыю маёмасці.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

■

ДОПОЛНИТЕЛЬНАЯ ИНФОРМАЦИЯ К ИЗВЕЩЕНИЮ

РУП «Белспецконтракт»

о проведении 17-го от 04.09.2014 года открытого аукциона по продаже имущества республиканской собственности, *опубликованному в газете «Звязда» № 143 от 01.08.2014 года.*

Участник аукциона, желающий принять участие в аукционе в отношении нескольких объектов высвобождаемого имущества, вносит задаток в сумме, установленной для каждого из объектов высвобождаемого имущества.

УНП 101099370

Утерянные представительством Белгосстраха по Ленинскому району г. Минска бланки страховых полисов по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛ №№ 0569170, 0571450 **считать недействительными.** УНП 100122726

Уважаемые акционеры

ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш»

1 сентября 2014 года состоится внеочередное общее собрание акционеров **ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш»,** расположенного по адресу: г. Лида, ул. Советская, 70 (конференц-зал).

Повестка дня собрания:

1. Об утверждении изменений и дополнения в Устав ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш».

Начало работы собрания в 12.00.
Регистрация участников собрания с 11.00 до 11.50.

Наблюдательный совет ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш».

УНП 500021638

